ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЗАРА

ОРГАН БРЭСЦКАГА АБКОМА КП(Б)Б
І АБЛАСНОГА СОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

№ 141 (512) II Серада 18 чэрвеня 1941 г. II Цана 15 кап.

ПАВЕДАМЛЕННЕ НАРКАМФІНА САЮЗА ССР

Падпіска на Пазыку Трэцяй Пяцігодкі (выпуск чацвертага года) на 16 чэрвеня 1941 года дасягнула 10 мільярдаў 834 мільёнаў 229 тысяч рублёў, гэта значыць перавысіла ўстаноўленую суму пазыкі на 1 мільярд 334 мільёны 229 тысяч рублёў. У сувязі з гэтым Наркамфін СССР на аснове ўказання СНК СССР распарадзіўся далейшую падпіску на Пазыку Трэцяй Пяцігодкі (выпуск чацвертага года) з 17 чэрвеня 1941 года спыніць паўсямесна.

Народны суд

Разбіўшы ў кастрычніку 1917 года дзяржаўную машыну буржуазіі з яе чынаўніцкім, прагніўшым наскрозь, прадажным судовым апаратам, рабочы клас стварыў пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў новы, народны, выбарны суд.

Партыя большэвікоў і совецкі ўрад неспынна ўдасканальвалі суд і паставілі яго на вышыню, недасягальную для капіталістычных краін. Усюды ў гэтых краінах суды знаходзяцца ў поўнай залежнасці ад капіталістаў і памешчыкаў. Усюды ў гэтых краінах законы накіраваны супроць народа. Усюды ў гэтых краінах народ баіцца суда, ненавідзіць суд.

Незалежнасць і выбарнасць усіх суддзяў і народных засядацеляў з'яўляецца асновай совецкага правасуддзя. Разгляд справ ва ўсіх судах ажыццяўляецца з удзелам народных засядацеляў, апрача выпадкаў, спецыяльна прадугледжаных законам. Народныя засядацелі выбіраюцца на тых-жа падставах, што і суддзі. Народным засядацелям у судовым працэсе належаць тыя-ж правы, што і суддзям. Гэтага няма ў найбольш «дэмакратычных» канстытуцыях капіталістычных краін.

У 1938 годзе на аснове Канстытуцыі СССР Вярхоўным Советам СССР выбран Вярхоўны суд СССР — вышэйшы судовы орган нашай дзяржавы.

У 1939 годзе Вярхоўнымі Советамі 11 саюзных рэспублік і Вярхоўнымі Советамі аўтаномных рэспублік выбраны Вярхоўныя суды гэтых рэспублік.

У 1940 — 41 гадах выбраны Вярхоўныя суды ў пяці новых саюзных рэспубліках.

У 1941 годзе закончаны выбары судоў краявых і абласных, акруговых, судоў аўтаномных абласцей. Гэтыя суды выбраны тэрмін на пяць год краявымі, абласнымі, акруговымі Советамі дэпутатаў працоўных і Советамі дэпутатаў працоўных аўтаномных абласцей.

Выбары былі шырокай праверкай гэтых судоў. Яны значна ўзмацнілі іх састаў надзейнымі і кваліфікаванымі работнікамі, маючымі вялікі практычны вопыт судовай работы і тэарэтычную падрыхтоўку.

Некаторая, параўнаўча невялікая, частка старога састава не была перавыбрана. Праверка выбарамі паказала, што некаторыя старыя суддзі не адпавядаюць тым высокім патрабаванням, якія совецкі народ прад'яўляе совецкаму суддзі.

Сярод членаў судоў повага састава павысіўся лік асоб з вышэйшай юрыдычнай адукацыяй. Кадры ўмацаваліся ў дзелавых і палітычных адносінах.

Выбраны 13.817 народных засядацеляў. Гэта — перадавыя рабочыя і калгаснікі. Многія з іх — стаханаўцы, ударнікі. Народная, социялістычная інтэлігенцыя займае заметнае месца сярод народных засядацеляў у судах вышэйшых інстанцый.

Цяпер па чарзе выбары народных судоў і народных засядацеляў у іх. Народныя суддзі і народныя засядацелі выбіраюцца грамадзянамі раёна на падставе ўсеагульнага, прамога і роўнага выбарчага права пры тайным галасаванні тэрмінам на тры годы.

Выбары народных суддзяў і народных засядацеляў — гэта справа ўсенародная. Яна датычыцца не аднаго толькі Народнага Камісарыята Юстыцыі. Гэта — прамая справа ўсіх партыйных, усіх совецкіх, усіх грамадскіх арганізацый. Ім прадастаўлена права вылучаць кандыдатаў у народныя суддзі і народныя засядацелі, і яны павінны вылучыць людзей, дастойных народнага давер'я, партыйных і непартыйных большэвікоў, даказаўшых на справе сваю адданасць радзіме, сваю чэснасць і справядлівасць.

Народны суддзя выражае ў сваёй дзейнасці совецкі закон. Ён — яго насіцель і страж. А совецкія законы ствараюцца для народа, у інтарэсах народа, для аховы социялістычнага, народнага здабытку, у адпаведнасці з задачамі комуністычнага выхавання працоўных.

Совецкі закон ёсць народная праўда. Народны суддзя, які выконвае з чэсцю свае пачотнае назначэнне, — гэта палітычны, дзяржаўны дзеяч, партыйны і непартыйны большэвік. Непрымірымасць да ворагаў народа, прамата, чэснасць і справядлівасць, чулыя адносіны да чалавека — гэта яго важнейшыя рысы.

Партыя і ўрад выхавалі, клапаціўна вырасцілі асноўнае ядро народных суддзяў, стварылі ім аўтарытэт сярод насельніцтва. Народны суддзя Міхаіл Мамучашвілі — гэта адзін з многіх. Хоць ён малады, яго глыбока паважае насельніцтва 1-га участка Тбіліскага прыгараднага раёна. Міхаіл Мамучашвілі бачыць свой раён не толькі ў чатырох сценах сваёй судовай камеры. Ён падымаецца ў горы і разбірае складаныя справы ў прысутнасці народа. Ён уважліва прыглядаецца да людзей, знаёміцца з эканомікай раёна. Рашэнні таварыша Мамучашвілі абдуманыя і справядлівыя. Яны не даюць таму поваду да суцяжніцтва і валакіты.

Такімі павінны быць усе народныя суддзі. Але ў судзейскай сям'і не без урода. Газета «Ленинский путь» (Самарканд) расказвае аб тым, як народны суд у Нурацінскім раёне прыгаварыў да паўтара годаў турмы начальніка раённай канторы сувязі Кузенкіна за тое, што ён адмовіў сакратару раённага камітэта партыі Азізаву і раённаму пракурору Закіраву ў бясплатным выкарыстанні міжгароднага тэлефона. Народны суддзя парушыў совецкі закон, забыў аб незалежнасці. А як выглядае народны суддзя 2-га участка горада Мінска Дрозд, які дапамагаў памочніку пракурора БССР Тамаркіну грубейшым чынам, наперакор закону, захапіць належачую грамадзяніну жылёвую плошчу і ўслужліва ператаскваў на сабе пракурорскую мэблю.

Усенародныя выбары будуць і ўсенародная праверкай састава народнага суда. Народ выбірае і ўмацуе сваім давер'ем тых суддзяў, якія чэсна ахоўвалі совецкі закон і абаранялі народ ад ворагаў. Народ алмяце ў сторану недастойных суддзяў, бязгушных бюракратаў.

Суддзі незалежны. Гэта не значыць, аднак, што яны стаяць дзесьці ў старане ад совецкіх, партыйных і грамадскіх арганізацый, што народны суд — «сам па сабе», а раённы, да прыкладу, камітэт партыі або раённы совет — таксама «сам па сабе». Не, дапамога народнаму суду, клопаты аб ім, палітычнае выхаванне судовых работнікаў, вырашчванне судовых кадраў — гэта важнейшая справа ўсіх партыйных і совецкіх органаў. Гэта іх прамая задача — падняць аўтарытэт народнага суддзі, ахоўваць яго незалежнасць, зрабіць народнага суддзю пачотнай асобай у раёне.

Выбары паказуць, як партыйныя і совецкія органы спраўляліся з гэтай задачай.

Раён павінен ведаць свайго суддзю. Суддзя павінен ведаць свой раён. Гэта дзве стараны адной і той-жа справы. Але не заўсёды выконваецца гэта справа з дастатковай поўнатой.

Ёсць у Маскве раёны, якія праяўляюць інтарэс да работы народных судоў. Народны суддзя 11-га ўчастка Фрунзенскага раёна тав. Кузнецова ведае старшыню выканкома райсовета тав. Шыліну, бачыла яе ў сябе ў судзе. А ці ведаюць кіраўнікі Чыгуначнага раёна сваіх народных суддзяў? Сумніцельна. Яны не праяўлялі заметнага інтарэсу да іх работы.

Народнаму засядацелю наш закон адводзіць віднае і пачотнае месца ў народным судзе. Народны засядалель непасрэдна звязвае народнага суддзю з насельніцтвам. Ён не прафесіянальны судовы работнік. Таму народныя засядацелі павінны работаць у годзе, як правіла, не больш 10 дзён. Да іх вылучэння трэба адносіцца з асаблівай увагай, з большэвіцкімі клопатамі. А на справе ёсць мясцовыя советы, якія закінулі работу з народнымі засядацелямі, не клапоцяцца аб іх змене, вылучаюць часам малапісьменных людзей. Усенародныя выбары пакончаць з гэтай нарочнай практыкай.

Народны суддзя—гэта адна з цэнтральных фігур совецкага жыцця. Яго месца павінна на справе адпавядаць яго высокай, адказнай, пачотнай задачы. Гэта — прамы доўг партыйных і совецкіх арганізацый. Народ наш з велізарным інтарэсам адносіцца да народнага суддзі, давярае яму. Ён жадае, каб суд ва ўсім адпавядаў агульнаму палітычнаму і культурнаму ўзроўню краіны. Уваходзячы ў судовае памяшканне, грамадзянін павінен адчуваць, што тут адбываецца вялікая справа, што тут ён — перад тварам совецкага закона. Знешні выгляд суда і ўвесь змест судовага працэса, яго аб'ектыўнасць, справядлівасць, увага да старон, строгасць суда да парушальнікаў закона — ўсё павінна ўмацоўваць у совецкім чалавеку глыбокую павагу да совецкай дзяржавы, да яе сілы, да яе маралі.

Усенародныя выбары народных судоў на чарзе. Да гэтых выбараў павінны загадзя рыхтавацца партыйныя, совецкія, комсамольскія, грамадскія арганізацыі.

(Пераданы артыкул «Праўды» ад 17 чэрвеня 1941 г.).

Рэвалюцыйны буравеснік

«Ніхто з буйных пісьменнікаў нашай краіны, ды і ў іншых краінах не ведаў так блізка жыццё «нізоў» народа пры капіталізме, — гаварыў тав. В. М. Молатаў у прамове, прысвечанай памяці Горкага. — Ніхто з іх не перажыў па сабе самым столькі жорсткасцей і агіднасцей з боку нізоў-эксплаататараў. Ніхто з іх нават проста не бачыў сваімі вачыма столькі закатаваных паднявольным працай і забітых гнётам капітала, як наш Горкі, у якога ўсё гэта выкавала непрымірымасць і рэвалюцыйную нянавісць да капіталістычнага ладу і беззаветную веру ў вызваленчую сілу комунізма».

Горкі разгарнуў у сваіх творах ўсебадымаючую карціну спусташэння чалавека і чалавечнасці ў капіталістычным свеце.

Са старонак горкаўскіх твораў паўставалі вобразы людзей, зламаных воўчым укладам жыцця, выкінутых на «дно», зажыва пахаваных. Успомнім, напрыклад, «Страсти-Мордасти» — апавяданне аб страшным апагаўшы дзяцінства і мацярынства ў свеце, які варожы ўсяму чалавечаму.

Выкрыццё жахаў капіталізма ў творчасці Горкага адрознівалася такімі асаблівасцямі, такімі новымі рысамі, якіх, вядома, не магло быць нават у самых геніяльных пісьменнікаў мінулага. Ніхто з іх не мог указаць першапрычыну ўніжэння і зганьбавання чалавека ў буржуазным грамадстве і шляхі барацьбы з гэтым ладам. Праца для Горкага была самай высокай, самай выдатнай праявай лепшых чалавечых сіл і здольнасцей. Праца стварыла самаго чалавека, вызначыла яго адрозненне ад жывёлы. І калі праца не цэніцца, калі ў капіталістычным свеце яна адчужана ад чалавека, ператворана ў тавар, то не цэніцца і чалавек, і ўсё жыццё становіцца бесчалавечным. Такая была ісціна, мастацкі адкрыць якую Горкаму дапамагло вучэнне марксізма-ленінізма. Усе праблемы гуманізма, барацьбы за вызваленне чалавека, неразрыўна злучаліся для Горкага з барацьбой рабочага класа за вызваленне працы.

Мастакі мінулага малявалі толькі адмоўныя, змрочныя стораны капіталізма. Горкі ясна ўбачыў, што ў нетрах капіталістычнага грамадства выспявае вялікая, варожая гэтаму грамадству сіла.

У гэтым і закладзена тлумачэнне мастацкай «тайны» Горкага — здзіўляючага спалучэння ў яго творах, здавалася-б, такіх незлучымых рэчаў: «паказу свінцовых агіднасцей быта» з глыбокай, светлай радасцю жыцця, якая пранізвае ўсю горкаўскую творчасць. На самой справе, як многа прыгнятаюча жорсткага, бесправсетна тужлівага паказана ў славутай аўтабіяграфічнай трылогіі — «Дзяцінства», «У людзях», «Мае ўніверсітэты»! Колькі тут карцін здзекаў над асобай, як многа чалавечага гора скапцэтравана ў гэтых творах! І ўсё-ж мы бачым за ўсім гэтым зззянне асляпляльна яркіх фарбаў жыцця, блікі сонца і добра адчуваем, што справа тут у магутнай творчай сіле працоўнага народа, выказанай Горкім. Аповесці аб жыцці хлопчыка, затым — падлетка і юнака Алёшы Пешкова былі адначасова і аповесцямі аб рускім працоўным народзе, аб яго адаронасці, аб яго — па словах Горкага — «фантастычнай таленавітасці».

Кроўная, непасрэдная сувязь з масай працоўных і вызначыла навізну горкаўскай творчасці.

Лепшыя пісьменнікі мінулага бачылі ў працоўным, галоўным чынам, афяру, пяшчаснага, забітага, прыгнечанага чалавека. Горкі зразумеў магутнасць працоўнай большасці чалавецтва. Ён угледзеў яе порш за ўсё ў працы. Апісанні працы ў Горкага глыбока своеасаблівы і выдатны тым, што праца паўстае як магутная рэвалюцыйная сіла. Нават простая, некваліфікаваная праца волжскага грузчыка вырастае ў творах Горкага ў гераічную сімфонію сілы, творчага багацця народа, рэвалюцыйнай страсці.

«Працавалі так, нібыта выгаладаліся па працы, нібыта даўно чакалі прыемнасці шырыць з рук па рукі чатырохпудовыя мяшкі, бегам насіцца з цюкамі на спіне. Працавалі іграючы, з вясёлым захапленнем дзяцей, з той п'янай радасцю рабіць, саладзей якой толькі абдыманне жанчыны...

Я таксама хапаў мяшкі, цягаў, кідаў, зноў бег і хапаў, і здавалася мне, што і сам я, і ўсё навокал завярцелася ў бурнай плясцы, што гэтыя людзі могуць так страшна і весела працаваць без стомленасці, не шануючы сябе — месяцы, годы, што яны могуць, ухапіўшыся за калакольні і мінарэты горада, сцягнуць яго з месца, куды захочуць.

Я жыў гэтую ноч у радасці, не выпрабаванай мною, душу азарала жаданне, жаданне пражыць усё жыццё ў гэтым поўшалёным захапленні дзеяння...

Здавалася, што такому напружанню радасна разлютаванай сілы нішто не можа процістаяць, яна здольна стварыць цуды на зямлі, можа пакрыць усю зямлю цудоўнымі палацамі і гарадамі, як аб гэтым гавораць мудрыя казкі...

І да двух гадзін дня, пакуль не перагрузілі ўвесь тавар, поўтолыя людзі працавалі без адпачынку, пад праліўным дажджом і рэзкім ветрам, прымусіўшы мяне з захапленнем зразумець, якімі магутнымі сіламі багата чалавечая зямля» («Мае ўніверсітэты»).

Усёй сваёй творчасцю Горкі даказваў, што нішто не можа процістаяць сіле працоўнага чалавецтва, што гэтая сіла здольна стварыць любое цуда, змясці са свайго шляху любую перашкоду. Горкі страсна хацеў выхаваць у кожным працоўным чалавеку разуменне гэтай магутнасці, выклікаць у ім сілу гнева, полымя страсці і ўпэўненасць у перамозе». Горкі сцвярджаў ідэал наступальнага чалавека, здольнага да барацьбы. У гэтым сказалася вялікае гістарычнае чуццё нашага Горкага, песняра надыходзячай перамогі комунізма ва ўсім свеце.

Горкі пачаў сваё літаратурнае жыццё на крутым пераломе гісторыі. Наступала эпоха імперыялізма, эпоха войн і рэвалюцый, набліжалася рашаючая сутычка двух светаў. У абодзвух лагерах — і ў лагеры буржуазіі і ў лагеры пролетарыята — з небывалай вастрынёй асазнавалася неабходнасць сіле процістаяць сілу. У буржуазіі за душой не заставалася нічога, акрамя фізічнай сілы, голада, гвалту.

Ужо Ніцшэ добра зразумеў гэта і ўзяў на сябе ролю выхавацеля «моцных людзей» буржуазіі, адкрыта высунуўшы ідэал «белакурай бестыі», рабаўласніка, каланізатара, кавквістадара, па-свойму «цэльнага» суб'екта, які адмовіўся ад яўных-бы та ні была «перажыткаў» гуманізма, ад чалавечнасці. «Філасофія» Ніцшэ была адказам буржуазіі на расшырэнне і рост рабочага руху. «Гаспадары» адкідвалі ўсю ранейшую гуманістычную фразеалогію, усе традыцыі ліберальнай «прыгожасці душы».

Працоўнае чалавецтва адказала на адкрытую буржуазіяй вайну супроць гуманізма з'яўленнем у літаратуры грандыёзнай фігуры Горкага.

Звярынай сіле буржуазнага свету рабочы клас проціставіў вайўнічы гуманізм, неадзялімы ад барацьбы, выкоўваючы новых людзей — магутных, дзёрзкіх, якія не ўяўляюць сабе жыцця без барацьбы, ведаюць, што такое сіла і жадаюць быць моцнымі.

Ніцшэ гаварыў «моцнаму»: слабага штурхані!

Горкі гаварыў «слабаму»: асазнай сваю сілу — і будзеш моцным!

У сваіх «Гутарках аб рамесле» Горкі пісаў, што ніцшэанскаму прынцыпу «падаючага штурхані» ён ужо ў маладыя гады проціставіў прынцып «паўстаючага падтрымай». На самай справе, ужо ў казках старухі Ізергіль развенчваліся індывідуалізм, драпежніцтва, ніцшэанскі «зверхчалавек» у вобразе адзначаецца Ларры і ўзнімаўся вобраз Чалавека з вялікай літары, увасоблены ў юнаку Данко. Ларра быў блізкі да той драпежнай «бестыі», якую ўслаўляў Ніцшэ, і Горкі жорстка пакараў Ларру.

У далейшым горкаўскі гераічны вобраз наступацельнага чалавека, непрымірымага барацьбіта за шчасце людзей, прадстаў ужо не як легендарна-рамантычны Данко, а як зусім рэалістычныя вобразы рэвалюцыйнага пролетарыя Ніла, героя п'есы «Мяшчане», большэвіка Сінцова і іншых герояў п'есы «Ворагі», Паўла Власава і іншых большэвікоў з аповесці «Маці» і г. д. Усе гэтыя вобразы былі авеяны той-жа рамантыкай подвіга і мужнай любві да людзей, тымжа нафасам наступлення на ўсё цёмнае, душнае, цеснае, варожае чалавеку.

У п'есе «Ворагі» процістаяць друг другу людзі і нелюдзі. Гэта тэма развіваецца ва ўсім ходзе п'есы у мноства рэплік, ва ўсіх узаемаадносінах дзейнічаючых асоб. Тэма немінучасці канчатковага азвярэння, адзічання буржуазіі належыць да ліку пастаянных, карэнных тэм і мастацкай творчасці і публіцыстыкі Горкага.

Не выпадкова, разумеецца, адзін з гераяў аповесці «Маці» перафразіруе славуты лозунг міжнароднай пролетарскай салідарнасці; ён гаворыць: «Людзі ўсіх краін, еднайцеся!»

У адным з сваіх позніх артыкулаў, «Яшчэ аб механічных грамадзянах», Горкі пісаў, што калі рабочыя і сяляне ўсяго свету «моцна, па-прыяцельску з'еднаюцца, — ім лёгка будзе скінуць са сваёй шыі капіталістаў, якія ўжо даўно перасталі быць людзьмі, а становяцца ўсё больш драпежнымі і крывавымі жывёламі». «Капіталіст, — падкрэсліваў Горкі ў другім артыкуле, — не можа быць «гуманным», усё чалавечае — акрамя жывёльнага ў чалавеку — чужое яму».

Горкі стварыў галерэю партрэтаў гаспадароў капіталістычнага свету і іх слуг. Усе гэтыя партрэты адрозніваюцца індывідуальнай своеасаблівасцю, але ў кожным з іх так ці інакш развіваецца тэма страты буржуазнай чалавечнасці. Прычыну гэтага адзічання Горкі бачыў у тым, што «капіталізм «усё, што мог, ужо зрабіў» і зараз з'яўляецца ракавай апухолю працоўнага чалавецтва... Капіталісты — міжнародная арганізацыя грабіцеляў, забойц».

Крывавае вар'яцтва ўсяго таго жыцця, якое стварае капіталізм эпохі ўпадку, з выдатнай сілай паказана ў чацвертай частцы «Жыцця Кліма Самгіна». Вобраз бандыта фінансавага капітала, удзельніка міжнароднай банкірскай шайкі, Захара Берднікава з'яўляецца партрэтам паразітарнай імперыялістычнай буржуазіі. Гэтая буржуазія здольна толькі на арганізацыю забойстваў і разбою. Банкір параджае бандыта, указваў Горкі. Берднікаў спакойна прызнаецца ў тым, што банкір здольны даць грошы па арганізацыю землетрасення, калі гэта прынясе добры процант.

У артыкуле «Аб культурах» з вялікай сілай праз'рэння і ненавісці Горкі гаварыў аб шаленстве імперыялістычнай буржуазіі:

«Ідыётычная злачынасць буржуазных боек робіцца асабліва агіднай, калі падумаеш аб тым, якую велізарную колькасць разумнай, каштоўнейшай працы, металу, вынаходніцтва знішчылі крамнікі ўчора, знішчаць заўтра. Колькі гарадоў, фабрык, заводаў будзе зруйнавана ў пыл і прах, колькі будзе затоплена выдатна зробленых караблёў, папсавана зямлі. Будзе знішчана мноства дзяцей. У канечным рахунку злачынае вар'яцтва класа тлустых людзей зводзіцца да таго, што яны прымушаюць рабочых, сялян, інтэлігентаў працаваць па знішчэнне рэзультатаў работы і па ўзаемнае самазнішчэнне».

У славутым артыкуле «З кім вы, «майстры культуры?» Горкі параўноўваў сучасную буржуазію з чумой: «Чума таксама была амаль нармальнай з'явай сярэдневякоў, але чума амаль знікла, і цяпер ролю яе на зямлі выконвае буржуазія».

Якую хлусню яшчэ можа высунуць у сваю «ідэалістычную» абарону сучасная буржуазія?

«Расавая тэорыя — апошні «ідэалагічны» рэзерв здыхаючага капіталізма», указваў Горкі.

Расавую «тэорыю» Горкі лічыў найбольш мярзотным відам буржуазнага чалавеканенавістніцтва.

«Асабіста я, — гаварыў Горкі, — заўсёды лічыў і лічу прапаведнікаў расавай і племянной ненавісці людзьмі выраджэўшымися і социяльна-небяспечнымі».

Свой класічны артыкул «Пролетарскі гуманізм» Горкі заканчваў выражэннем радаснай упэўненасці ў блізасці вялікай ачысцяльнай навальніцы; Горкім пры гэтым кіравала тое-ж пачуццё, якое прадыктавала яму ў свой час гордыя радкі «Буравесніка».

«Набліжаецца час, — пісаў Горкі, — калі рэвалюцыйны пролетарыят наступіць як слон на звар'яцеўшы, мітуслівы мурашнік захватчыкаў, наступіць і раздавіць яго. Гэта немінуча... Пагібель гэтай мешчасці — акт найвялікшай справядлівасці, і акт гэты гісторыя загадвае ўтварыць пролетарыяту. За гэтым вялікім актам пачнецца сусветная, дружная і брацкая работа народаў свету — работа свабоднай, цудоўнай творчасці новага жыцця».

Зноў і зноў Горкі клікаў буру і, як Буравеснік, угадваў у самай паветры гісторыі яе блізасць.

Па ўсяму складу свайго характару Горкі быў байцом. У адным з артыкулаў апошніх год ён сказаў, што ён, стары, пойдзе радавым байцом у той бой, які прадстаіць Чырвонай Арміі.

Горкі жыў і памёр, як баец, загінуўшы на свяшчэнным баявым пасту. Сусветная буржуазія смяртэльна ненавідзела Горкага іменна за тое, што ён быў непрымірымым барацьбітом супроць капіталізма, вытхоўваў у працоўных усяго свету волю да барацьбы, да паступлення, за тое, што ён быў любім усім працоўным чалавецтвам.

Наёмныя забойцы, якія былі на пасе ў найбольш подлых, найбольш адзічаўшых «гаспадароў» капіталістычнага свету, з'білі Горкага. Але ва ўсім свеце гучыць магутнае, праўдзівае слова нашага Горкага і чутны горды яго заклік «Пяхотай на шляхі бурэ!».

В. Ермілаў.

ЗАВОЗ УБОРАЧНАГА ІНВЕНТАРА

Добра растуць азімыя і яравыя на палях нашай абласці. Ураджай сёлета абяцае быць багатым. Своечасова і без страт убраць гэты ўраджай — адказнейшая задача партыйных і совецкіх арганізацый, МТС, калгасаў, працоўных адпаасобнікаў. Падрыхтоўка да ўборкі пачалася. Калгасы і адпаасобнікі набываюць новы інвентар, рамантуюць стары.

Аблспажыўсаюз разам з абласной канторай сельгасснаба арганізавалі завоз у абласць неабходнага ўборачнага інвентара. Ужо часткова завезены сенакасілкі, жнейкі, малацілкі, тачыльныя прылады і г. д. На складах і ў крамах спажывецкай кааперацыі абласці ёсць косы, сярпы, малаткі, бабкі, брускі і манташкі. Аблсельгасснаб мае для патрэб калгасаў на 120 тысяч руб. розных запасных частак для ўборачных машын, прыводныя пасы, рыхтуе 200 стапоў калёс і г. д.

ШТО ДАЛА РАБОТА ПА ГРАФІКУ

У гэтым годзе, у сувязі з запаздалай вясной, цагельная вытворчасць Ружанскага райпромкамбіната была пушчана на поўны ход толькі ў маі месяцы. Тым не менш, план выконваецца з поспехам. У гэтым вялікую ролю адыграў графік.

Работа па графіку дала магчымасць сістэматычна правяраць, як выконваецца план усім калектывам і кожнай брыгадай упаасобку. Графік стварыў умовы для шырокага разгортвання социялістычнага спаборніцтва на цагельнай вытворчасці.

Усе брыгады, спаборнічаючы паміж сабой, дабіліся таго, што нормы штодзённа выконваюцца і перавыконваюцца. Стаханаўскія брыгады т. т. Пражэнця і Лешчынскага выконваюць штодзённа нормы на 150 — 170 проц.

У рэзультаце стаханаўскай работы прадпрыемствы за адзін месяц выпрацавалі столькі цэглы, колькі за ўвесь мінулы год.

Р. Градоўчык.

На Лысьвенскім металургічным заводзе (Молатаўская область) выпрацоўваюць [illegible]ткі розных узораў высокаякаснай і мастацкай пасуды.
Цэнтралёр-сартыроўшчыца цэха **С. П. Мусіхіна** (справа) і памочнік сартыроўшчыцы **Е. П. Бусыгіна** сартыруюць пасуду. Фота В. Паскова (ТАСС).

У ДЫВІНЕ ЗРЫВАЕЦЦА ЛЕСАСПЛАЎ

Няма ні адной галіны народнай гаспадаркі, якая-б не адчувала патрэбы ў лесных матэрыялах.

Дзе-жа праходзіць сплаў у Дывінскім раёне? Трэба сказаць, што вельмі дрэнна. План другога квартала па раёну выкананы толькі на 54,7 процанта. 2 тысячы кубаметраў будаўнічай драўніны і 7 тысяч кубаметраў дроў сплаўучастак да гэтага часу не прыняў ад Брэсцкага леспрамгаса. Драўніна гэта знаходзіцца на румах Белазёрскага і Арэхаўскага каналаў. Гэты факт гаворыць аб тым, што начальнік сплаўканторы тав. Рытэрман не адчувае адказнасці за даручаную яму справу.

Белазёрска-Радастаўскія румы прынялі 10 тысяч кубаметраў драўніны, а сплавілі па 7 чэрвеня ўсяго толькі 500 кубаметраў, што складае 5 процантаў. Такая работа на сплаву і вязцы драўніны тлумачыцца тым, што дзесятнік т. Коцюр несур'ёзна адносіцца да гэтага важнейшага мерапрыемства. Недазвальныя [illegible] падрыхтаваны румы гужбой, кпышкамі. Гэта прывяло к таму, што працуцэйнасць працы рабочых вельмі нізкая. Рабочыя не ведаюць норм і расцэнак, [illegible] адзейнічае цякучасці рабочай сілы. Амаль штодзённа на сплаве працуюць новыя рабочыя.

Адмаючыхся трох участкаў наперадзе [illegible] Ленінаўскі рум на Арахаўскім канале (майстар тав. Нагач). Квартальнае заданне ён выканаў на 98,4 процанта. Тав. Нагач [illegible] замацаваць пастаянныя кадры рабочых на сплаве. Нядрэнна працуе і Павіцкі рум на Арэхаўскім канале (майстар тав. Бронштэль). План другога квартала ён выканаў на 82,3 процанта.

Трэба сказаць, што ў раёне не наладжана як след забеспячэнне рабочых працуючых па сплаве. Лесхарчпромгандаль (дырэктар т. Яцына) дрэнна забяспечвае таварамі шырспажыва рабочых лесасплава і лесазагатовак, хаця на базе ёсць вялікая колькасць прадуктаў харчавання і промтавараў. Для забеспячэння рабочых сплава адкрыт толькі адзін ларок у Дывіне, а непасрэдна на сплаве і лесазагатоўках ларкоў няма. Радастаўскі сельсавет знаходзіцца ад раённага цэнтра ў 30 кілометрах, а Павіт — у 15 кілометрах, з прычыны чаго рабочыя сплава не могуць бываць у гэтым ларку. Неабходна лесхарчпромгандлю ў бліжэйшыя дні адкрыць ларкі непасрэдна на месцах работы.

Дырэктару сплаўканторы т. Вендзелю неабходна больш звяртаць увагі на работу сплаўнога ўчастка, начальнікам якога працуе тав. Рытэрман, бо ў большасці румаў Брэсцкай области не забяспечана своечасовае закапчэнне работ.

Дывінскі РК КП(б)Б (сакратар тав. Тарасаў) і выканком райсовета дэпутатаў працоўных (старшыня т. Лапацін) недастаткова ўдзяляюць увагі лесасплаву, і не патрабуюць ад кіраўнікоў сплаўучастка ўзорнай работы.

Н. Грабяневіч,
інструктар абкома КП(б)Б.

АСУШАЮЦЬ БАЛОТА

Першымі ў Брэсцкім раёне вышлі на мелыярацыйныя работы працоўныя аднаасобнікі в. Казловічы. Штодзённа на асушэнцы магістральнага канала тут працуе ад 20 — 30 чалавек. Закончыўшы [illegible] канала на працягу 3 клм., сяляне пачалі капаць яго далей, да межы з [illegible] балота, якое належыць сялянам в. Сухарэвічы — там працягваць канал будуць сяляне гэтай вёскі.

Некалькі дзён таму назад пачалі копку асушальных каналаў калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імені Сталіна, Казловіцкага сельсавета. Штодзённа на балоце працуе брыгада з пяці чал. Сяляне в. Лышчыцы за тры дні на балоце Цюпрыкі пракапалі 150 метраў асушальнага канала.

ЦУКРОВЫЯ БУРАКІ НА ТАРФЯНЫХ ГЛЕБАХ

У калгасе імені Сталіна, Косаўскага раёна, арганізаван гатункова-выпрабавальны пункт Галоўцукру па цукровых бураках на тарфяных глебах.

Насеў цукровых буракоў вытвараў 29 мая і ўжо зараз чотка відаць радкі з дружнымі ўсходамі. Пачалася першая шарэнга гэтай працаёмкай культуры. У першы дзень калгаснік Чымбар Фросі на шарэнгу выканала норму на 111 процантаў. Якасць яе работы добрая.

Задачай гатункова-выпрабавальнага пункта з'яўляецца выпрабаванне па ўраджайнасці і сахарыстасці насеяных пры аднолькавых умовах на тарфяніках розных гатункаў цукровых буракоў, вырашчаных удалаўскай, рамонскай, льгоўскай, іванаўскай і верхняцкай селекцыйнымі станцыямі.

Тымчук,
аграном Любішчыцкага гатункова-выпрабавальнага пункта.

Аб культурных установах раённага цэнтра

У вялікім двухпавярховым будынку сканцэнтраваны важныя палітасветныя ўстановы Поразава — раённая бібліятэка, клуб, кіно. Усім гэтым культурным камбінатам кіруе тав. Арабін. На жаль, ён не праяўляе ні ўмення, ні жадання правільна арганізаваць работу па гэтым адказным участку.

На другім паверсе размешчана бібліятэка. Яна павінна забяспечваць літаратурай працоўных усяго раёна. А попыт на кнігу няспынна расце. На 1 чэрвеня бібліятэка налічвала каля 700 чытачоў, і колькасць іх магла-б быць значна большай. Але бібліятэка ніяк не задавальняе запатрабаванняў чытачоў.

Кніжны фонд састаіць з 2160 кніг і журналаў, але сярод іх многа падручнікаў і кніг, недаступных масаваму чытачу. З мастацкай літаратуры — не больш 200 кніг. Зусім мала дзіцячай літаратуры. Такой, займаемы бібліятэкай, малы і непрыстасаван для бібліятэкі. Большасць кніг валяецца на падлозе. Ёсць яшчэ 2 пакойчыкі, вызначаныя пад чытальню. Але сюды рэдка хто заглядвае: тут брудна, няўтульна, ды большай часткай гэтая «чытальня» закрыта.

Не лепшы парадак і ў клубе. Палітычна-масавай работы тут не вядуць. У глядзельнай зале папуе антысанітарыя. Два месяцы таму назад тут устанавілі кіно, але працуе яно надзвычайна дрэнна. За май было прадэманстравана 5 — 6 карцін, і кожны раз кіносеансы выклікаюць справядлівае абурэнне гледачоў. Гук вельмі слабы, карціны часта рвуцца. 7 чэрвеня ішоў гукавы фільм «Ціхі Дон». Ён дэманстраваўся як «пямы». Асобныя сеансы зрываліся з-за таго, што нясвоечасова развешваліся афішы.

Аб усім гэтым не могуць не ведаць у раённым аддзеле народнай асветы. Але гэта іх зусім не турбуе.

Раённы цэнтр павінен мець узорна працуючыя культурныя ўстановы.

Л. КАНАВАЛЕНКА.

Няма ўвагі ўзнаўленню конскага пагалоўя

Злучка конематак па Дывінскаму раёну зрываецца. План злучной кампаніі выкананы на 30 процантаў. Такое становішча тлумачыцца тым, што райза і, у прыватнасці, заатэхнік тав. Сцібло зусім мала ўдзяляюць увагі ўзнаўленню конскага пагалоўя — гэтай важнейшай гаспадарчай кампаніі.

Тав. Сцібло бывае ў сельсоветах вельмі рэдка. А калі і едзе ў вёску, то ніякай растлумачальнай работы не праводзіць, а займаецца голым адміністраваннем, папяровай пісанінай. Убачыўшы правал злучной кампаніі, Сцібло пачаў шукаць віноўнікаў і знайшоў (?). З чэрвеня ў дакладной на імя старшыні выканкома райсовета ён піша, што «дрэннае становішча коней па аднаасобнаму сектару і вялікія работы, як пасеўная кампанія, лесавывазкі, моцна сказваюцца на ходзе злучной кампаніі конепагалоўя.»

Ці не вярней будзе сказаць, што вінаваты ў гэтым не «вялікія работы», а кіраўніцтва райза і заатэхперсанал.

Н. Езавітаў,
загадчык агульнага аддзела выканкома Дывінскага райсовета.

НЕАБХОДНА ДАПАМОГА

Рыхтуючы дастойную сустрэчу XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі, члены нашай арцелі разгарнулі соцыялістычнае спаборніцтва за выкананне двухмесячнага плана. Сваё абавязацельства мы выканалі з часцю.

Гістарычныя рашэнні XVIII партканферэнцыі натхнілі работнікаў арцелі на далейшую барацьбу за пасяховае выкананне плана. У арцелі яшчэ шырэй разгарнуліся соцыялістычнае спаборніцтва і стаханаўскі рух. Калі ў першым квартале перавыконвалі свае нормы 32 чалавекі, то цяпер з 69 чалавек, працуючых непасрэдна на вытворчасці, перавыконваюць нормы 50 чалавек. Работнікі вяровачнага цэха Конік Мошка і Гутэнберг штодзённа выконваюць сваю норму на 138 процантаў. Работніца вязальнага цэха тав. Каплан Зіна выконвае норму на 154 процанты, Зоншайн Хая — на 162 процанты, Зінько Федосія — на 169, Алесік Ніна — 171, Козак Ліда — на 178.

У выніку павышэння прадукцыйнасці працы поўтадовы план мы выканалі за пяць месяцаў на 142 процанты і далі дзяржаве звыш плана прадукцыі на 42.450 рублёў.

Адпак па асобных асартыментах мы план недавыканалі. На 4100 рублёў мы недадалі дзяржаве шарсцяной тканіны, на 22.500 рублёў вяровак, на 2.800 рублёў ваты.

План выпуску шарсцяной тканіны мы недавыканалі з прычыны таго, што з вялікім спазненнем устанавілі ткацкі станок, а вяровак і ваты — з-за адсутнасці сыравіны.

Трэба сказаць, што аблмногапромсаюз дрэнна забяспечвае нас сыравінай. Першыя пяць месяцаў мы не мелі ў дастатковай колькасці бавоўны, што паслужыла прычынай недавыканання плана выпуску ваты.

За чэрвень мы маглі-б даць краіне дадаткова прадукцыі на дзесяткі тысяч рублёў, але з першага чэрвеня мы вымушаны былі спыніць работу некаторых цэхаў, бо сапсаваўся матор. У нас стаіць сукнавалка, мы не можам пусціць у ход часальныя машыны, не можам выраблянь пражу. Вязальны і ткацкі цэхі пакуль што працуюць на раней падрыхтаванай пражы, але таксама працуюць не на поўную магутнасць.

Сумная справа. Ішло ўсё добра, вытворчасць з кожным месяцам пашыралася, арцель расла, і раптам усё спынілася. А гэтага можна было не дапусціць. Мы яшчэ восенню ставілі пытанне перад аблмногапромсаюзам аб тым, каб нам адпусцілі сродкі на новы матор, але многапромсаюз пяцігуў гэту справу да тых пор, пакуль не адмовіўся працаваць стары матор. Зараз фармальна нам грошы на матор як быццам адпусцілі, але атрымаць іх мы не можам. У нас забіраюць і іх назад за дасланую нам бавоўну, а яе мы не можам пусціць у вытворчасць з-за адсутнасці матора.

Печкоўскі,
старшыня Кобрынскай трыкатажнай арцелі «Чырвоны спят».

ДАКЛАД АБ МІЖНАРОДНЫМ СТАНОВІШЧЫ

14 чэрвеня ў Доме соцыялістычнай культуры Валынкі (г. Брэст) сабралася многа рабочых, служачых і хатніх гаспадынь. Кожны з іх ведаў, што сёння праводзіцца даклад аб міжнародным становішчы.

8 гадзін 45 мінут вечара. Загадчык Дома соцкультуры тав. Давыдчык прадастаўляе слова для даклада лектару абкома партыі тав. Багноўскаму. Не гледзячы на тое, што даклад працягваўся 2 гадзіны 20 мінут, працоўныя слухалі яго з вялікім напружаннем і ўвагай. Трэба прызнаць, што дакладчык змог даклад пабудаваць змястоўна і цікава. Ён глыбока асвяціў ход ваенных дзеянняў, эканоміку ваюючых краін, расказаў аб мірнай палітыцы краіны Саветаў.

Тав. Багноўскі заклікаў працоўных працаваць яшчэ лепш на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва, дзейна рыхтавацца да абароны краіны.

Добрае ўражанне засталося ад даклада ў прысутных.

Пасля даклада было расказана працоўным, што ў бліжэйшыя дні ў Доме соцкультуры будзе праведзен вечар пытанняў і адказаў. На ім працоўныя атрымаюць вычарпальныя адказы па ўсе цікавячыя іх пытанні. Для паступаючых пытанняў у Доме соцкультуры ўстаноўлена спецыяльная скрынка.

Тактычныя заняткі ў П-скай часці ЗахАВА. У паступленні. Кулямётчыкі **В. М. Анжаўраў** (злева). і **П. І. Здабноў.**
Фота БЕЛТА

АГРАТЭХНАКОНСУЛЬТАЦЫЯ

БАРАЦЬБА З ІЛЬНЯНОЙ БЛОШКАЙ

З паступленнем гарачага і сухога надвор'я на пасевах ільну з'явіўся шкоднік — ільняная блошка. Гэта маленькія, скачучыя жучкі чорнага колеру або чорныя з жоўтымі палосамі на падкрылках. Блошкі зімуюць у верхнім слаі глебы або пад сухімі лісцямі і астаткамі расліц. Адкладванне яек і развіццё лічынак блошак адбываецца галоўным чынам на розных смецпёвых расліцах.

Блошкі асабліва жыццяздольны ў сухое і гарачае надвор'е і з'яўляюцца звычайна ў другой палове мая і першай палове чэрвеня. У гэты час яны энергічна скачуць па пасевах ільну, ад чаго, між іншым, і атрымалі назву блох, і моцна паражаюць пасевы. Пашкоджанне заключаецца ў вытрызанні ў лісцях, асабліва па краях, невялікіх язваў. Пры моцных пашкоджаннях лісці засыхаюць, і расліна поўнасцю гіне. Акрамя гэтага блошкі паражаюць точку росту ільну, ад чаго расліна таксама гіне.

З папераджальных мер вялікае значэнне мае барацьба з смяцёвымі расліцамі, на якіх размнажаюцца шкоднікі. Для барацьбы з блошкай на пасевах неабходна прымяняць хімічныя меры шляхам апылывання пасеваў ядавітымі хімікатамі. Да іх адносіцца, перш за ўсё, крэмнефтористы натрый. Ён прымяняецца для барацьбы з шкоднікамі, маючымі грызучыя ротавыя часткі. Гэта шэры дробны парашок. Ён прымяняецца ў чыстым выглядзе або ў сумесі з талькай або дарожным пылам, галоўным чынам для апылывання пасеваў у колькасці 8—12 кілограмаў на гектар.

Мышъяковакіслы кальцый — белы парашок, можа прымяняцца ў чыстым выглядзе і ў сумесі з 1—2 часткамі дарожнага пылу, а таксама попелу або талькі. Расход яда для апылення пасеваў — 5—10 кілограмаў на га.

Прымяняецца таксама парыжская зелень у сумесі з гашанай вапнай (1 частка зелені на 10 частак вапны). Можна прымяняць для апылывання табачны пыл, чысты або ў сумесі з гашанай вапнай (1 частка табачнага пылу і 1 частка вапны).

Апылванне пасеваў ільну трэба вытвараць з раніцы да ўсходу сонца або пазвечар, калі паяўляецца на пасевах раса. У гэты час блаха мала рухома, а пры з'яўленні сонца яна адразу прыступае да сваёй работы. Для апылывання прымяняюцца ручныя апылывацелі «РВ — 1», «Ціп-топ» і конныя апылывацелі «Кон—2». Там, дзе няма апылывацеляў, трэба апылываць простым спосабам: зрабіць для гэтага марлевыя мяшочкі, праз якія прасыпаецца парашок. Апылванне вытвараецца па ветру, з такім разлікам, каб парашок яду роўнамерна размяркоўваўся па раслінах, а не кучкамі.

Абыходзіцца з ядам трэба асцярожна, каб пазбегнуць атраўлення людзей і жывёлы. Калгаснікі і сяляне-аднаасобнікі павінны звярнуць асаблівую ўвагу на барацьбу з земляной блошкай, знішчаючай пасевы. Многае ў гэтым напрамку павінен зрабіць і сельгасхімснаб. Пакуль што ён бяздзейнічае. Хімікаты ляжаць на базах. Іх неабходна ў самы бліжэйшы час разаслаць па раёнах, каб яны маглі пайсці на знішчэнне шкоднікаў пасеваў.

І. Палеўчанка,
старшы аграном Сямяніцкага райземаддзела.

ЗША і БАРАЦЬБА ЗА АТЛАНТЫКУ

Па старонках амерыканскага друку

У адным з артыкулаў, апублікаваных у [illegible]еньскай кніжцы амерыканскага журнала «Фарэйн аферс», было выказана цвёрдае палажэнне: амерыканская ваенная палітыка зводзіцца ў асноўным да двух момантаў. Адзін з іх заключаецца ў эканамічнай і ваеннай абароне Заходняга паўшар'я, а другі — у падтрымцы Брытанскай імперыі ў яе барацьбе супроць дзяржаў «асі».

Гэтыя дзве тэмы не сходзяць са старонак амерыканскага друку. Але характэрна, што, калі, напрыклад, у мінулым годзе амерыканскі друк настойліва падкрэсліваў неабходнасць эканамічнага пранікнення Злучаных Штатаў у Лацінскую Амерыку, то зараз, не адмаўляючыся ад гэтага палажэння, друк з такой-жа настойлівасцю ўсяляк стараецца даказаць, што лацінскія рынкі Амерыкі не менш неабходны, чым рынкі Лацінскай Амерыкі, і што эканамічная незалежнасць Заходняга паўшар'я — «неажыццявімая мара», выражаючыся словамі «Фарэйн аферс».

Што датычыць другой тэмы, г. зн. пытання аб аказанні дапамогі Англіі, то амерыканскі друк ад шырокавяшчальных лозунгаў і разважанняў адносна абароны «дэмакратыі» ўсё часцей і часцей у [illegible] больш практычную аргументацыю, сцвярджаючы, што ў аснове гэтай палітыкі ЗША ляжыць абарона амерыканскіх інтарэсаў, што дапамога Англіі павінна быць аказана па прычынах не столькі міжнароднага, колькі эканамічнага і стратэгічнага парадку.

Вядомая амерыканская журналістка Элен Тампсон, палемізіруючы з ізаляцыяністамі, піша ў газеце «Нью-Йорк геральд трыбюн»:

«Мы не можам прадаставіць рынка для прадукцыі краін Паўднёвай Амерыкі. Злучаныя Штаты не маюць спажыўцоў на гэтыя прадукты. Спажыўцы на гэтыя мільёны тон шпанцы, жыта, мяса, медзі і бавоўны — гэта не тыя 90 мільёнаў, якія складаюць насельніцтва Паўднёвай Амерыкі, не тыя 130 мільёнаў, якія насяляюць Злучаныя Штаты і не тыя 11 мільёнаў, якія насяляюць Канаду, бо гэтыя краіны самі маюць шпанцу, жыта, мяса і медзь. Спажыўцы гэтых прадуктаў — у Еўропе, гэта тыя 396 мільёнаў перанаселенага высокаіндустрыялізаванага поўвострава Азіі, які называецца Заходняй Еўропай. Сюды не ўваходзіць Расія.

Кожны год Еўропа купляе ў Паўднёвай Амерыцы тавараў на 2,5 млрд. долараў. Кожны год Злучаныя Штаты купляюць у Паўднёвай Амерыцы тавараў на 200 — 300 мільёнаў долараў. Кожны год Еўропа прадае Паўднёвай Амерыцы гатовых прамысловых тавараў на суму ў мільярд долараў, а Злучаныя Штаты — на 600 мільёнаў. Мы можам прадаваць у Паўднёвую Амерыку тавары толькі ў тым выпадку, калі Паўднёвая Амерыка мае грошы, каб гэтыя тавары купіць, а гэтыя грошы яна можа атрымаць толькі ў рэзультаце поўнага абароту свайго гандлю.

Калі Германія выйграе вайну ў Еўропе, яна стане самым вялікім, адзіным і неабходным спажыўцом паўднёва-амерыканскіх тавараў, бо Паўднёвая Амерыка з'яўляецца крыніцай харчоў і сыравінных матэрыялаў для Еўропы. Калі Злучаныя Штаты захочуць умяшацца або нарушыць гэты гандаль, то яны стануць злейшымі ворагам Паўднёвай Амерыкі.

Паўднёва-амерыканскія порты будуць запоўнены германскімі параходамі; германскія камерцыйныя і тэхнічныя, а магчыма, і ваенныя дарадцы будуць у кожнай паўднёва-амерыканскай рэспубліцы».

Нарысаваўшы такую перспектыву, Дароці Тампсон пытае:

«Што-ж нам астаецца рабіць: сыйсці на-пішто або выцесніць немцаў сілай? Але тады мы станем «агрэсіўнай нацыяй», а Германія стане «абаронцай лаціна-амерыканскай незалежнасці». Нешчам не трэба будзе ўтаргацца ў Лацінскую Амерыку. Іх паклічуць, іх запросяць абараняць свабоду, гандаль і правітанне Лацінскай Амерыкі супроць «паўночнага калоса».

Дароці Тампсон прыходзіць к выводу, што Злучаныя Штаты не могуць адмовіцца ад кантролю над гандлем паміж амерыканскім кантынентам у цэлым і Еўропай. Журнал «Фарэйн аферс» ідзе далей і сцвярджае, што Амерыка не менш кроўна, чым у еўрапейскіх рынках, зацікаўлена таксама ў рынках Брытанскай імперыі.

«Брытанская імперыя, — піша журнал, — мае рынкі і сыравіну, якія неабходны Заходняму паўшар'ю. Мы таму зацікаўлены ў захаванні Брытанскай імперыі, і ў такім яе захаванні, каб яе рынкі былі адкрыты для нашых экспарцёраў, а яе сыравінныя рэсурсы даступны для нашых імпарцёраў».

* * *

У барацьбе, якая разгарнулася паміж Англіяй і Германіяй, буйнейшае значэнне мае бітва за Атлантыку. Іменна таму амерыканскі друк у артыкулах, прысвечаных пытанню аб дапамозе Англіі, удзяляе асаблівую ўвагу гэтай бітве. Так, небезвядомы Уолтар Ліпман у «Нью-Йорк геральд трыбюн» піша:

«Барацьба, якая ідзе вакол Брытанскіх астравоў, з'яўляецца, несумненна, важнай бітвай у Атлантыцы. Але зараз разгортваецца бітва значна большага маштаба — бітва за кантроль над усёй Атлантыкай. Мэта гэтай бітвы заключаецца не толькі ў тым, каб перарваць камунікацыі паміж Брытанскімі астравамі і амерыканскім кантынентам. Мэта гэтай бітвы будзе вельмі хутка заключацца ў тым, каб перарваць сувязь паміж Паўночнай і Паўднёвай Амерыкай... У гэтай вялікай бітве, а не на бліжнім або на дальнім Усходзе, будзе вайна выйграна або прайграна».

Далей Ліпман пераходзіць да абмеркавання таго, што ён называе «геаграфіяй Атлантыкі».

«Знамянальны факт, які закранае геаграфію Атлантычнага акіяна, — піша ён, — заключаецца ў тым, што Паўночная Амерыка і Паўднёвая Амерыка — абедзве бліжэй да Еўропы, чым адна да адной. Такім чынам, ад Нью-Йорка да Белема, які знаходзіцца ў вусці Амазонкі, 2.975 марскіх міль. Ад Панамы да Белема — 2.309 міль. А ад Белема да Порто-Грандэ на партугальскіх астравах Зялёнага мыса 1.782 міль, а калі дадаць яшчэ 400 міль, то мы акажамся ў Дакары, французкай марской базе ў Афрыцы.

Белем — бліжэйшы да нас бразільскі порт. Трэба адзначыць, што ад Нью-Йорка да Рыо-да-Жанейро — сталіцы Бразіліі — 5 тысяч міль, а да Буэнос-Айрэса — сталіцы Аргентыны — 6 тысяч міль. Адпак да Рыо-да-Жанейро да Гібралтара — 4.200 міль, а ад Буэнос-Айрэса да Гібралтара каля 5.400 міль...

Карацей кажучы геаграфія Атлантыкі такая, што для Злучаных Штатаў было-б надзвычай [illegible] [illegible] вяраць сувязь паміж Паў[illegible] і Паў[illegible] і Францыяй [illegible] днёвай Амерыкай, а для дзяржаў «асі» было-б вельмі лёгка іх атакаваць. З другога боку, дзяржавам «асі» было-б адносна лёгка канваіраваць параходы, якія ідуць з Паўднёвай Амерыкі, а нам было-б вельмі цяжка перашкодзіць гэтаму, апіраючыся на нашы базы ў Вест-Індыі».

Ліпман лічыць, што «гэтыя асноўныя геаграфічныя факты будуць адыгрываць рашаючую ролю ў падзеях, якія падрыхтоўваюцца». Ён мае на ўвазе далейшае разгортванне барацьбы за Атлантыку, пашырэнне гэтай барацьбы на паўднёвую частку акіяна. У сувязі з гэтым ён звяртае ўвагу на наступныя акалічнасці.

«Калі мы паглядзім на карту, — піша ён, — то ўбачым, што паміж пазіцыямі, якія займаюць дзяржавы «асі», і Атлантыкай ёсць яшчэ цэлы ланцуг стратэгічных пазіцый, пачынаючых з Дальняй Поўначы. Там ёсць Ісландыя, якая знаходзіцца пад англа-канадскім кантролем, Грэнландыя, якая абараняецца англічанамі, а таксама намі. Далей ідуць Брытанскія астравы — найвялікшая крэпасць і марская база ў свеце. Далей следуе Францыя, якая хоць акупіравана Германіяй, але блакіравана Англіяй. Затым ідзе Іспанія і Іспанскія астравы, пакуль нейтральныя. За імі ідуць Партугалія і яе астравы — Азорскія і Зялёнага мыса, пакуль нейтральныя. І, нарэшце, далей размешчана Французская афрыканская імперыя ад Рабата да Дакара...

Такім чынам, важнейшыя порты і астравы, неабходныя для кантролю над Паўднёвай Атлантыкай, — гэта іспанскія, партугальскія і французскія астравы і гавані».

Па думцы Ліпмана, іменна з гэтымі [illegible] і [illegible] і [illegible] і французскімі [illegible] і [illegible] як ён піша, «вялікія рашэнні бліжэйшых месяцаў, а можа быць і тыдняў».

Цікавае супадзенне: журнал «Фарэйн аферс» у красавіцкім нумары публікуе артыкул, аўтар якога аддаецца такім-жа «геаграфічным разважанням», як і Ліпман. Ён, у сваю чаргу, даказвае, што

«Ад Мадысона (галоўны горад штата Вісконсін) да Буэнос-Айрэса далей... чым ад Мадысона да Бенгаліі. Анкара на такой-жа адлегласці ад Мадысона, як прыкладна і Буэнос-Айрэс... Гібралтар бліжэй да Мадысона, чым сталіца Балівіі».

Аўтар прадаўжае і далей свой ланцуг «геаграфічных разважанняў», каб даказаць неабходнасць умацавання стратэгічнай пазіцыі ЗША ў Атлантыцы. Ён заяўляе:

«Праблема абароны Паўднёвай Амерыкі — марская, а не кантынентальная праблема, і калі панаванне на моры ў Паўднёвай Атлантыцы пяройдзе ў рукі варожых дзяржаў, то мы не зможам ні стварыць там свае ўласныя базы, ні перашкодзіць пранікненню гэтых дзяржаў па кантынент».

Аўтар артыкула з'яўляецца старонікам стварэння далёка высунутай уперад лініі абароны. Ён піша:

«Злучаныя Штаты павінны разглядаць лінію абароны заходняга паўшар'я яко другарадныя, як лінію, якая неабходна падрыхтаваць на той надзвычайны выпадак, калі будзе прарвана першая лінія абароны... Менш рызыкоўна заняць зараз пазіцыю абароны ўсімі сродкамі, сумесна з Англіяй, марой і апорнымі пунктамі, камандуючымі над морамі ўсяго свету — Сінгапура, Гавайскіх астравоў, Панамы, Гібралтара, Суэца і самой Англіі, — чым дапусціць паражэнне Англіі і абараняць у адзіночстве Заходняе паўшар'е».

(«Правда»).

ПЯЦЬ ГОД З ДНЯ СМЕРЦІ А. М. ГОРКАГА

1936 БУРАВЕСНІК РЭВОЛЮЦЫІ, БАРАЦЬБІТ ЗА СПРАВУ КОМУНІЗМА 1941

ВЯЛІКІ ПАТРЫЁТ

(У МУЗЕІ А. М. ГОРКАГА).

Працоўным нашай краіны добра вядома па шматлікіх рэпрадукцыях і фатаграфіях карціна совецкага мастака В. Сварога, на якой паказаны маршал Совецкага Саюза К. Е. Варашылаў і вялікі рускі пісьменнік, А. М. Горкі ў ціры. Аляксей Максімавіч рыхтуецца страляць. У яго пільны погляд, ён выглядае мішэнь і будзе паражаць яе трапна, нібы перад ім сапраўдны вораг, якога неабходна «знішчыць бязлітасна і няшчадна...»

Гэтая карціна, выстаўленая ў адной з залаў Дзяржаўнага музея А. М. Горкага ў Маскве, заўсёды прыкоўвае ўвагу шматлікіх наведвальнікаў, якія знаёмяцца з раздзелам музейнай экспазіцыі «Горкі — патрыёт совецкай радзімы».

Партрэты, пажаўцеўшыя дакументы, выразкі з газет, выказванні пісьменніка, падарункі, якія атрымаў Горкі ад чырвонаармейцаў, — набываюць хвалюючы сэнс. Знаёмячыся з гэтымі матэрыяламі, зноў і зноў пранікаешся высокімі патрыятычнымі пачуццямі, якімі была насычана ўся дзейнасць вялікага мастака.

Горкі быў звязан трывалымі сувязямі непарушнай дружбы з Чырвонай Арміяй, з яе байцамі і камандзірамі. Сярод экспанатаў ёсць пісьмо Горкага рэдакцыі газеты «Часовой ОКДВА». Аляксей Максімавіч пісаў: «...Праходзяць змрочныя часы, калі перамагала грубая сіла рабаўлікоў. Зараз у свеце расце... бясстрашная разумная энергія пролетарыята. Кожны баец павінен адчуваць сябе ўмяшчэннем гэтай непераможнай энергіі».

Байцы Чырвонай Арміі адказвалі свайму любімаму пісьменніку гарачай любоўю і ўдзячнасцю. Пролетарская Стралковая дывізія прэзідыюсіць Горкаму баявую вінтоўку з надпісам на металічнай пласцінцы — «Трапнаму стралку за повага соцыялістычнага чалавека». Гэтая вінтоўка выстаўлена на адным з шчытоў музея. Тут-жа, побач, у вітрыне за шклом—падарунак адной з кавалерыйскіх часцей: шпоры, скрабніца і шчотка. Да іх прыкладзена пісьмо байцоў:

Кавалеристы-военкоры
Подарок прислали таков:
Щётку, скребницу и шпоры.
Пусть чистит мир от барской своры
Железом и щетиной слов.

А чырвонафлотцы Балтыкі пісалі Аляксею Максімавічу:

«...Ахоўваючы мірную працу соцыялістычнай краіны, байцы, камандзіры і палітработнікі Чырвонай Балтыкі шлюць баявое чырвонафлоцкае прывітанне буравеснику рэвалюцыі, змагару супроць імперыялістычнай вайны і інтэрвенцыі, буйнейшаму пісьменніку пролетарыята — Максіму Горкаму. Нашы караблі, фарты і самалёты гатовы па першаму закліку ленінскай партыі і ўрада даць сакрушальны адпор усім сілам імперыялізма, якія рыхтуюцца напасць на нас і якіх трапна і ярка выкрывае Горкі».

Вялікі грамадзянін, народны пісьменнік быў блізкі і дарагі кожнаму совецкаму чалавеку. Заўсёды цаніўшы ў чалавеку яго настаянае імкненне да свабоды і шчасця, Горкі аддаваў свае сэрца народу — барацьбіту, народу — будаўніку новага жыцця.

Звяртаючыся да совецкай моладзі, вялікі пісьменнік гаварыў: «Усё больш упэўнена цвёрды крок моладзі, і ярчэй гарыць у вачах яе радасць жыцьцё у краіне, дзе так хутка і прыгожа выхоўваецца цела і так вогненна, пераможна цвіце ў ім баявы, гераічны дух, штодзённа выяўляючы сябе ў рабоце па абагачэнне народа, па абарону радзімы, супроць ворагаў, амаль штодзённа зазяючы смелымі подвігамі на карысць сваёй краіны».

Прызыўна гучаць словы Горкага: «І калі ўспыхне вайна супроць таго класа, сіламі якога я жыву і працую, — я таксама пайду радавым байцом у яго армію. Пайду не таму, што — ведаю, іменна яна пераможа, а таму, —што вялікая, справядлівая справа рабочага класа Саюза Советаў — гэта мая законная справа, мой доўг.»

Найвялікшы гуманіст нашага часу, ён пітаў самую жгучую, неўціхаміраную нянавісць да ўсіх ворагаў і здраднікаў радзімы. «Калі вораг не здаецца, — яго знішчаюць», — вучыў Горкі.

Музей дэманстрыруе шматлікія рукапісы і кнігі пісьменніка, у якіх друкаваліся яго палкія публіцыстычныя артыкулы аб абароне соцыялістычнай айчызны. Горкі гаварыў, што калі спатрэбіцца, совецкі народ «пойдзе ў бой так-жа мужна, як уладарна ён увайшоў у жыццё, як катэгарычна пачаў будаваць сваю, соцыялістычную дзяржаву». Горкі цвёрда ведаў, што ў будучай вайне супроць ворагаў чалавецтва «ўстане армія, кожны баец, які будзе добра ведаць і адчуваць, што ён б'ецца за сваю свабоду, за свае права быць адзіным уладаром сваёй краіны. Гэты баец і пераможа».

Патрыятызм Горкага пітаўся глыбокай верай у таржаство комунізма, у невычарпальныя сілы совецкага народа, беззаветнай любоўю да партыі і таварыша Сталіна. На сценах музея многа фатаграфій, на якіх таварыш Сталін засняты разам з А. М. Горкім. Па мрамарнай дошцы залатымі літарамі начартаны словы прывітання, якія звернуты да Горкага ў дзень 40-годдзя яго літаратурнай дзейнасці:

Дарагі Аляксей Максімавіч!

Ад душы вітаю Вас і моцна паціскаю руку. Жадаю Вам доўгіх год жыцця і работы на радасць усім працоўным, на страх ворагам рабочага класа.

І. СТАЛІН.

Многа экспанатаў музея расказвае аб вялікай дружбе Сталіна і Горкага, аб іх сустрэчах і гутарках.

Калі Горкі захварэў, яго наведаў таварыш Сталін.

За 6 дзён да смерці Горкага ў газетах быў апублікаван тэкст праекта Сталінскай Канстытуцыі. Прачытаўшы э хваляваннем гэты гістарычны дакумент соцыялістычных перамог, Горкі сказаў:

«У нашай краіне зараз...нават кампі спяваюць».

І. Родзін.

ГОРКАЎСКАЯ ВЫСТАЎКА У АБЛАСНОЙ БІБЛІЯТЭЦЫ

У чытальнай зале Брэсцкай абласной бібліятэкі адкрыта выстаўка, прысвечаная пяцігоддзю з дня смерці вялікага рускага пісьменніка Аляксея Максімавіча Горкага. На выстаўцы сабраны творы Горкага на рускай, беларускай, польскай і яўрэйскай мовах, кнігі аб Горкім, а таксама шматлікія фотаздымкі, якія адлюстроўваюць слаўнае багатае жыццё і многагранную творчую дзейнасць вялікага Горкага.

Выстаўка будзе адкрыта для наведвальнікаў да 25 чэрвеня.

22 чэрвеня ў чытальні будзе наладжана лекцыя аб творчасці А. М. Горкага.

З неапублікаваных дакументаў А. М. Горкага

Публікуемае ніжэй пісьмо Аляксея Максімавіча Горкага да акадэміка Н. Я. Марра адносіцца да пачатку 1934 года. Датычыцца яно пытання аб стварэнні «Гісторыі культуры». Вядома, што Горкі глыбока цікавіўся гісторыяй. Апрача таніх выданняў, як «Гісторыя грамадзянскай вайны» і «Гісторыі фабрык і заводаў», пачатых па яго ініцыятыве, ён распрацоўваў планы выдачэння «Гісторыі вёсні», «Гісторыі гарадоў», «Гісторыі культуры» і «Гісторыі жанчыны». Ён высока цаніў вучоную дзейнасць Н. Я. Марра, у прыватнасці работу кіруемага ім інстытута матэрыяльнай культуры над стварэннем «Гісторыі культуры» і «Гісторыі жанчыны». Тэкст пісьма перадруковаецца намі з журнала «Огонек».

Пісьмо акадэміку Н. А. Марру

Глыбокапаважаны Нікалай Яфаўлевіч.

Радуе мяне намер кіруемай Вамі ўстановы прыняцца за работу стварэння агульнай гісторыі культуры, г. зн. гісторыі ўзнікнення і развіцця той энергіі, якая, ствараючы скарбніцы культуры матэрыяльнай і шпіраючыся на іх, паставіла працоўнае чалавецтва перад тварам тых адкрыццяў навук, вынаходніцтваў тэхнікі і адлюстравання сапраўднасці ў мастацтве, якімі тружанікі свету нашага павінны калектыўна валодаць, як гэта дыктуе нам гістарычны працэс.

Гісторыю развіцця гэтай энергіі ніхто яшчэ не спрабаваў расказаць, паказаць так, як яна гэтага патрабуе. Зусім натуральна, што такую работу пачынаюць у краіне, дзе рост гэтай сілы прымае характар масавай з'явы і дзе яна разумеецца як самае магутнае выяўленне арганічнай матэрыі, ўспалымнёнай у чалавеку працэсамі яго працоўнай дзейнасці. Мне здаецца, што ў рабоце па гісторыі культуры варта зрабіць тое, чаго яшчэ ніхто не імкнуўся зрабіць, а іменна: асабліва рэзка расчляніць дзве тэндэнцыі гістарычнага працэса, геніяльна ўскрытыя Марксам.

Я маю на ўвазе рабаўласніцкую «класавую» тэндэнцыю, якая разглядае чалавека толькі як умяшчальніка фізічнай сілы і не адзначаную буржуазнымі гісторыкамі культуры, — невыразную, але ідучую з глыбокай старыны мару працоўнага чалавецтва аб магчымасці перамагання ўсіх супраціўленняў сіл прыроды інтарэсам чалавека...

Мара гэтая няспынна выражалася ў марах аб «каўры-самалёце», аб «ботах-скараходах», аб «жывой і мёртвай вадзе», аб «Васілісах прамудрых», якія тварылі цуды, аб людзях, якія спынялі рух сонца, цячэнне рэк і г. д. і т. п. Фальклор насычан апавяданнямі аб цудоўнай рэлі чалавека, а, няма-ж такой мары, якая не была-б выклікана да жыцця асазнанай, але незадаволенай патрэбай. Мары працоўнага чалавека аб казачных цудах маюць асновай сваёй зусім рэальнае і заканае імкненне да свабоды ад катаргі бесчалавечнай класавай працы. Па сутнасці, па сэнсу свайму, гэтая мара-глыбока гуманітарна і, вядома, мала агульнага мела з «гуманізмам» буржуазіі, хоць, магчыма, іменна яна мела ўплыў на развіццё гуманізма эксплаататараў, першапачаткова падказанага гуманізмам жрэцоў розных рэлігій — падказанага з тактычных меркаванняў палітыкі царквы, імкнуўшайся прымірыць непрымірымае: уладара і раба.

Мару гэтую мы знойдзем у рабоце сярэдневяковых алхімікаў, і, нарэшце, адкрыем яе ў пашыя дні ў нашай краіне, дзе літаральна сотні і сотні адданісьменных людзей заняты праектамі стварэння «вечнага рухавіка».

Мы павінны паказаць, як груба, жорстка і подла класавае грамадства скажала і гасіла гэтую, сапраўды і адзіна гуманітарную «мару», створаную людзьмі працы, і як гэта затрымлівала рост даследчай творчай думкі.

Вось, дарагі і паважаны Нікалай Яфаўлевіч, кой-якія мае меркаванні, мне захацелася паведаміць іх Вам, што я і раблю. Мне думаецца, што менш за ўсё мы павінны лічыцца з нормамі, канонамі і традыцыямі буржуазных спецыялістаў, спецыялізм якіх заўсёды ўключае ў сябе больш ці менш сур'ёзную дозу кратынізма. Мне здаецца таксама, што многія «павуковаўстаноўленыя ісціны» не толькі выветрыліся, памёрлі, пакінуўшы пасля сябе толькі славесную шкарлупу прыгожых фармуліровак, але што наогул чым хутчэй ідуць працэсы жыцця, тым больш кароткатэрмінова быццё «ісціны».

Мы, Саюз Советаў, агітіруем за ўнядрэнне ў жыццё найвялікшай ісціны, якая выдатна энергеціруе наш працоўны народ і таксама магутна павінна энергізаваць усе сілы і здольнасці сусветнай сям'і працоўных.

Сардэчна жадаю Вам добрага здароўя.

А. Пешкоў.

12. I. 34. Масква.

40,5 МІЛЬЁНА ЭКЗЕМПЛЯРАЎ ТВОРАЎ А. М. ГОРКАГА

Сёння спаўняецца 5 год з дня смерці вялікага пролетарскага пісьменніка А. М. Горкага. Выдатныя творы Горкага карыстаюцца велізарнай папулярнасцю ў працоўных нашай краіны. Паводле даных Усесаюзнай кніжнай палаты, яны выданы ў СССР за перыяд з 1917 года па 1 чэрвеня 1941 года агульным тыражом у 40,5 мільёна экземпляраў. На рускай мове кнігі А. М. Горкага выйшлі ў свет тыражом у 35,55 мільёна экземпляраў і па іншых мовах — больш чым у 5 мільёнаў экземпляраў.

Творы геніяльнага мастака слова да Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі былі мала даступны шырокім масам працоўных. За 1894 — 1916 годы яны былі выданы нямногім больш мільёна экземпляраў на 8 мовах. З першых год совецкай улады кнігі А. М. Горкага пачалі выдавацца масавымі тыражамі. Яны перакладзены на 65 мовах — украінскай, беларускай, грузінскай, азербайджанскай, армянскай, латышскай, татарскай і многія іншыя мовы народаў СССР.

Папулярныя кнігі вялікага рускага пісьменніка чытаюць зараз на роднай мове многія народы нашай краіны, не меўшыя да Кастрычніцкай рэвалюцыі нават сваёй пісьменнасці. Горкаўскія творэнні вельмі папулярны і сярод працоўных зарубежных краін.

Адна з самых вядомых кніг А. М. Горкага — «Маці» вытрымала ўжо 106 выданняў. Аповесць надрукавана ў колькасці больш 1,8 мільёна экземпляраў.

Раннія аповесці і апавяданні А. М. Горкага

Усякі, хто па-сапраўднаму любіць Горкага, несумненна, з радасцю сустрэў выданне зборніка яго забытых апавяданняў*) і новую публікацыю яго першай вялікай аповесці. Паявіўшыся аднойчы на старонках правінцыяльных газет (галоўных чынам «Самарской газеты», «Нижегородского листка», «Волгаря»), журналаў і зборнікаў, гэтыя творы не былі потым уключаны патрабавальным мастаком ні ў адзін са збораў яго твораў і таму асталіся не вядомымі шырокаму кругу сучасных чытачоў.

Вялікая частка ўпоў апублікаваных твораў адносіцца да першага дзесяцігоддзя літаратурнай дзейнасці Горкага. Гэтае дзесяцігоддзе, як вядома, прыпадае на тыя годы, калі, па вызначэнню В.І. Леніна, у нашай краіне пачынаўся пролетарскі перыяд масавай рэвалюцыйнай барацьбы, на чале якой ішлі рэвалюцыйныя соцыялдэмакраты, «барацьбіты, глашатаі бою, будзіцелі, званары рэвалюцыі».

Малады Горкі прыпоў у літаратуру поўны нянавісці да буржуазна-памешчыцкага ладу, літаратура для яго — зброя барацьбы супроць гэтага ладу.

Юнак Горкі ўжо ў пачатку сваёй літаратурнай дзейнасці выступіў як барацьбіт за чалавека, за яго права на працу і свабоду. Творчасць яго асветлена глыбокай мысляю, поўна гнеўнага пратэста і заклику да барацьбы супроць мяшчанства, тупога кансерватызма і ўсіх умоў, запяволваючых і зневажаючых чалавека.

Уважлівае вывучэнне ранніх твораў Горкага вельмі павучальна. Перш за ўсё здзіўляе багацце жыццёвага вопыту маладога пісьменніка, разнастайнасць тэм, шырыня ідэйнага зместу яго творчасці. Разумнае і назіральнае вока мастака, ахапляе адносіны амаль усіх соцыяльных слаёў тагачаснай Расіі. Перад чытачом праходзяць басякі і абываталі, жабракі і купцы, «галадаючыя з Расіі», рэвалюцыянеры і «томячыяся духам» расійскія інтэлігенты. І якое багацце прыёмаў і форм літаратурнай творчасці: нарыс, казка, легэнда, сказанне, алегорыя, жаправая карціна, маленькае апавяданне і вялікія палотны аповесцей.

Перад намі старонкі, поўныя сапраўднага жыцця, напісаныя рукой сапраўднага мастака. Чытаючы і перачытваючы забытае, чуеш малады голас Горкага, голас страснага і перакопанага ворага ўладзіцкага ладу.

Паказваючы «зло і бруд жыцця, хлусню і жорсткасць яго», Горкі ўзвялічвае чалавека, «моцнага духам», бунтуючага і пратэстуючага, жыццё якога «поўна буйных радасцей, прыгожага гневу, гордага ўпарства». «Траба, каб празрэлі слепыя, якіх так многа, траба, каб усе людзі з жахам і агідпасцю ўбачылі, як груба, несправядліва і агідна іх жыццё» («Гадзіннік»). Страшная праўда жыцця ў тым, што маці вымушана прадаваць сваё цела, каб даць асвету дзецям («Жанчына з блакітнымі вачыма»); дванаццацігадовы хлопчык кідаецца пад ногі коней купца, каб выратаваць блізкіх ад галоднай смерці.—«калі задушаць — грошай дадуць» («Калюша»); гандляр да зеваты пакутвае і здзекваецца над дзіцём толькі таму, што той безабаронны і галодны («Здзей»).

Глухі да гэтай праўды сыценькі мяшчанін, яму ўтульна і цёпла, ён дапаўняе тапным благапалуччам свайго жыцця злодзей і бруд акружаючай рачаіснасці. Пятай пратэстуе аграбленая ім у правах чалавека жонка і маці («Сон Колі», «Свабодныя дні»), пяхай пратэстуе зняважаная і ўтаптаная ў гразь дзяўчына («Прабуджэнне»), пяхай няшчасны і зашкаваны Рыжык кідаецца ў рэчку («Уцёк»), а забітая жанчына шукае ратунку ў пятлі («Нязгодны») — мяшчанін падзейна адгарадзіўся ад жыцця і радуецца таму, «што жыццё ніколі не здолее зачапіць яго, нарушыць яго абыякавыя адносіны да яго» («Жабрачка»). І хоць ён ясна бачыць страшны лёс сямігадовай дзяўчынкі-жабрачкі і немінучасць таго, што яму, як пракурору, у недалёкім будучым прыдзе па даказваць суду «неабходнасць засадзіць гэту дзяўчынку ў турму», ён пройдзе міма яе, бо не памерап займацца «дабрадзейнымі хваляваннямі аб бліжнім і лёсах яго». Яго непакоіць толькі адно: «Ды няўжо-ж нельга быць свабодным? Не адчуваць сябе абавязаным штосьці рабіць, чымсьці хваляванца—нельга?.. Але калі гэта так—гэта рабства!». Але, ратуючы сваё жыццё, ён вырве дошку з рук утапаючай любімай дзяўчыны і, трымаючыся за гэту дошку, будзе спакойна чакаць дапамогі. («Сон»).

Подласць і цынізм, жывёльны эгаізм, пошласць і абман выступаюць у быцці мяшчаніна, як паўсядзённасць, як норма яго паводзін. Толькі людзі галечы ў гэтым грамадстве ведаюць сапраўдную чалавечнасць, здольны па бескарыслівы, прыгожы подвіг. Злодзей Семага, ратуючы ад паліцэйскай аблавы, не можа прайміма падкінутага дзіцяці і сус яго за пазуху («Як злавілі Семагу»); бабулька Акуліна, якая жыве міластыняй і кветкажом, гасцінна абагравае ў сваёй зямлянцы такіх-жа няшчасных, як і сама яна («Бабулька Акуліна»).

Агаляючы «з папрокам, помстай» хлусню і абман, кроў і бруд асяроддзя ўладзіцкіх, Горкі ні на мінуту не пераставаў верыць у жывыя творчыя сілы, у чалавека. У гэтым плане выдатна апавяданне «Вездесущее», упершыню надрукаванае ў 1913 годзе.

«Вездесущее» — гэта праўда «аб жыцці рабочага народа, аб яго правах на працу і свабоду». Перад працоўнымі, у якім бы кутку свету яны ні жылі, паўстае адно пытанне:

«Ці задаволены вы вашым жыццём? Ці такое яно павінна быць, людзі? Хіба вы рабы і не хочаце лепшага?»

Так, людзі хочуць лепшага, за гэта лепшае яны ідуць на барацьбу і вераць у сваю перамогу, бо «няма і не будзе сіл, якія маглі-б забіць маладое сэрца свету». Гэта сэрца б'ецца ў грудзях старога негра, і ён цвёрда ведае:

«Гэта—соцыялізм! Ён—усюды: на Гаіці, у Глазгоу, Буэнос-Айрэсе—усюды! Ён — гэта сонца...»

Гэта маладое сэрца свету жыве і горача б'ецца ў творчасці Горкага. Вось чаму яго творчасць аптымістычна і вось чаму Горкі з самага пачатку сваёй літаратурнай дзейнасці стаў любімым пісьменнікам рабочага класа.

Вл. Грыгарэнка.

*) М. Горкі. Забытыя апавяданні. 1893—1918. Рэдакцыя і ўступны артыкул С. Д. Балухатага. Каментарыі Е. В. Сухава. ДВМЛ, 1940.

ЗА ШЧАСЦЕ ЎСІХ ЛЮДЗЕЙ

У Бесарабію ён папаў якраз як збіралі ўраджай вінаграду. Праца была слаўная, народ — цудоўны. Малаванне — бронзавыя, з пышнымі чорнымі вусамі, густымі валасамі да плеч, жанчыны — вясёлыя, стройныя з цёмнасінімі вачыма, таксама бронзавыя.

Аднаго разу ўвечары пасля дзённага збірання вінаграду пайшлі ўсе з песнямі і смехам на бераг мора. Алёша застаўся пад густым цепем вінаграднай лазіны. Да яго падышла старая малдаванка Ізергіль.

— Што ты не пайшоў з імі? — кінуўшы галавою, спыталася яна.

— Не хачу. — адказаў Алёша.

— У! Старымі родзіцеся вы, рускія, Хмурыя ўсе, як дэманы.. Баяцца цябе нашы дзяўчаты... А ты-ж малады і дужы...

З мора данесліся галасы, чыстыя, моцныя і звонкія.

— Ці чуў ты, каб яшчэ дзе-небудзь пялі так? — спытала Ізергіль, паднімаючы галаву і ўсміхаючыся бяззубым ротам.

— Не чуў. Ніколі не чуў... — прамармытаў Алёша ў захапленні.

— І не пачуеш. Мы любім пяяць. Толькі прыгожым добра пяюць, — прыгожыя, якія любяць пяяць. Мы любім жыць. Глядзі-ж, хіба не змарыліся за дзень тыя, што пяюць там? З усходу да захаду працавалі, узышоў месяц, і ўжо — пяюць .. Вось як трэба жыць...

Алёша ўспомніў сваю маладосць, свае горкія бадзяўні па чужых людзях, пяжкае жабрацкае жыццё простага чалавека і ад душы зайдросціў вясёлым людзям гэтага цёплага краю.

Калі ён расказаў свае думкі Ізергіль, яна адказала:

— Не павінна быць гора. Людзям трэба добра жыць, прыгожа кахаць і смяяцца. Волат Данко паказаў людзям шлях да шчасця, і не павінны людзі забывацца на яго.

— Які Данко? спытаўся Алёша.

— Я раскажу табе пра яго. Гэта старая казка...

І яна расказала Алёшу:

— «Жыў на зямлі калісьці адзін народ; непраходныя лясы аблягалі з трох бакоў табары гэтага народу, а з чацвертага — быў стэп. Былі гэта вясёлыя, сільныя і смелыя людзі. І вось прыйшла аднойчы цяжкая пара: з'явіліся аднекуль іншыя плямёны і прагналі рапейшых у глыб лесу. Там было балота і цемра, таму што лес стары быў, і так густа перапляліся яго галінкі, што праз іх не відаць было неба, і праменні сонца ледзь маглі прабіць сабе дарогу да балота праз густое лісце. Але калі яго праменні клаліся на ваду балот, дык паднімаўся смурод, і ад яго людзі гінулі адзін за адным. Тады пачалі плакаць жанкі і дзеці гэтага племені, а бацькі задумаліся і занудзіліся. Трэба было выйсці з гэтага лесу, а было толькі дзве дарогі: адна — назад, — там былі моцныя і злосныя ворагі; другая — наперад, там стаялі асілкі-дрэвы, шчыльна абняўшы адно аднаго магутнымі галінкамі, пусціўшы вузлаватыя карэнні глыбока ў цэпкую гвань балота. І страшна было, калі вецер біў па верхавінах дрэў, і ўвесь лес глуха гуў, нібы пагражаў і пяяў жалобную песню тым людзям. Людзі сядзелі і думалі праз доўгія ночы, пад глухі гоман лесу ў агрутным смуродзе балота. Яны сядзелі, а цені ад вогнішча скакалі навакол іх у маўклівых скоках, і ўсім здавалася, што гэта не цені скачуць, а святкуюць урачыстасць злыя духі лесу і балота... І пасляабелі людзі ад сумных дум... Страх перамог іх, скуў ім моцныя рукі, жанчыны ад жаху плакалі над пябожчыкамі, што памерлі ад смуроду, і пад лёсам жывых, і вось баязлівыя словы сталі чутны ў лесе, спачатку палахлівыя і піхія, а пасля ўсё мацней і мацней... Ужо хапелі ісці да ворага з пакорнасцю... Але тут з'явіўся адважны Данко, малады, прыгожы, і выратаваў усіх адзін.

«Ён сказаў сваім таварышам:

«—Думкаю не звернеш каменя з дарогі. Хто нічога не робіць, з тым нічога не здарыцца. Што мы трацім сілы на думку і тугу? Уставайце, пойдзем у лес і пройдзем яго скрозь, бо мас-ж ён, нарэшце, канец. Ізем! Ну! Гэй!

«Паглядзелі на яго і ўбачылі, што ён лепшы ад усіх, таму што ў вачах яго свяцілася шмат сілы і жывога агню.

«— Вядзі-ж нас! — сказалі яны.

«Тады ён павёў. Дружна ўсе пайшлі за ім, — верылі яму. Цяжкі шлях гэта быў! Цёмна было, і на кожным кроку балота разяўляла сваю прагную гнілую пасць, глытала людзей, а дрэвы засланялі дарогу магутнай сцяною. Перапляліся іх галінкі паміж сабою, як змеі, выцягнулася ўсюды карэнне, і кожны крок каштаваў шмат поту і крыві. Доўга ішлі яны. Усё гусцейшым рабіўся лес, усё менш было сіл. І вось пачалі пракаць на Данко, казаць, што дарэмна ён, малады і неспрактыкаваны, павёў іх некуды. А ішоў ён наперадзе ўсіх і быў вясёлы і ясны.

«Але аднаго разу навальніца трукнула над лесам, зашапацелі дрэвы глуха, грозна. І зрабілася тады так цёмна, нібы ў лесе сабраліся ўсе ночы, колькі іх было на свеце з той пары, як ён радзіўся. Ішлі маленькія людзі, паміж вялікіх дрэў і ў грозным шуме бліскавіц ішлі яны, і асілкі-дрэвы хісталіся, скрыпелі і гулі сярдзітыя песні. А з цемры галін глядзела па людзей нешта страшнае, цёмнае і халоднае. Гэта быў цяжкі шлях, і людзі, зморацыя ім, засумавалі. Са злосцю і гневам накінуліся яны на Данко, які ішоў наперадзе ўсіх.

«— Ты, — сказалі яны: — пікчэмны і шкодны чалавек для нас! «Ты павёў нас і згубіў, і за гэта ты загінеш»

«— Вы сказалі: «вядзі» — і я павёў! — крыкнуў Данко і стаў супроць іх тварам. — У мяне ёсць мужнасць весці, вось таму я павёў вас! А вы? Вы толькі ішлі і не маглі схаваць сілы на дарогу больш доўгую! Вы толькі ішлі, ішлі, як чарада авец!

«Але гэтыя словы раз'юшылі іх яшчэ больш.

«— Ты памрэш! Ты памрэш! — раўлі яны.

«Данко глядзеў на тых, для якіх ён патраціў столькі сіл, і бачыў, што яны, як зверы. Шмат людзей стаяла навокал яго, і, па абліччах іх, бачыў Данко, што не будзе яму ад іх літасці. У яго сэрцы ўскіпела абурэнне, але Данко схаваў яго ў сабе. Ён любіў людзей і нават у гэтую хвіліну не мог іх пакінуць на згубу. Запалала яго сэрца агнём жадання выратаваць, вывесці на лёгкі шлях, і тады ў яго вачах заззялі праменні таго магутнага агню. А людзі, убачыўшы, як ярка распаліліся яго вочы, настаражыліся, як ваўкі, думалі, што ён будзе змагацца з імі, і пачалі шчыльней абступаць яго, каб лягчэй ім было схапіць і забіць Данко.

«Яшчэ ярчэй запалала яго сэрца.

«А лес усё пяяў сваю сумную песню, гром грымеў, і ліў дождж.

— Што зраблю я, для людзей?.. — мацней грому крыкнуў Данко.

«І раптам ён разадраў рукамі сабе грудзі, выдраў з іх сваё сэрца і высока падняў яго над галавою. Яно палала так ярка, як сонца, ярчэй за сонца. І ўвесь лес заззяў, асветлены гэтым факелам пялікага кахання. Людзі-ж, здзіўленыя, сталі, як каменне.

«— Ідзем! — крыкнуў Данко і кінуўся наперад на сваё месца, высока трымаючы палаючае сэрца і асвятляючы ім шлях людзям.

«Яны рынуліся за ім зачараваныя, беглі шпарка і смела, захопленыя чароўным відовішчам палаючага сэрца. І цяпер гінулі, але гінулі без скаргі і слёз. А Данко ўсё ішоў наперадзе, і сэрца яго палала, палала!

«І вось раптам лес расступіўся перад ім, расступіўся і застаўся ззаду, дужы і немы, а Данко і ўсе людзі адразу трапілі ў мора сонечнага святла і чыстага паветра, прамытага дажджом. Навальніца была там, ззаду іх, пад лесам, а тут ззяла сонейка, уздыхаў стэп, бліскала трава ў дыяментах дажджу, і золатам ззяла рэчка... А з разадраных грудзей Данко гарачым струменем біла кроў.

«Зірнуў ён наперад, на шыр стэпу, кінуў радасны позірк па вольную і шчаслівую зямлю і засмяяўся горда. А пасля паваліўся і памёр. Людзі-ж, радасныя і поўныя надзеі, не заўважылі смерці яго і не бачылі, што яшчэ палае побач з трупам Данко яго адважнае сэрца...»

Калі старая скончыла казку і пачала драмаць, Алёша ў радасным узбуджэнні думаў пра праўду смелых і дужых, што аддаюць жыццё сваё за шчасце ўсіх людзей. І ці так ужо хмурае жыццё, калі ёсць такія людзі? Трэба змагацца.

У стэпу было ціха і цёмна, мора гула шумела. Алёша лёг на зямлю, прыкрыўся і моцна заснуў, нібы вымыты, падаадзёраны добраю байкаю.

На другі дзень скончылася праца, і Алёша рыхтаваўся ў доўгую дарогу. Перайшоўшы Бесарабію, дайшоў і да Дуная, межы Расіі. Аднаго разу запачаваў ён на беразе Чорнага мора, ля цыганскага табара. З мора дзьмуў вільготны халодны вецер і раздзьмухаў вогнішча. Злева бязмежны стэп, справа бясконцае мора, а ля вогнішча стары цыган Макар Чудра. Ён пільнаваў пакой свайго табара і размаўляў з Алёшам. Тое, што Алёша прыйшоў з далёкай Расіі, яго зусім не здзівіла.

— Дык ты хозяін! — сказаў ён — гэта добра... Ты слаўную долю выбраў сабе, саколе. Так і трэба: хадзі і глядзі, паглядзеўся, — кладзіся і памірай. Вось і ўсё! Я вось, глядзі, за пяцьдзесят восем гадоў столькі бачыў, што калі напісаць усё гэта па паперы, дык і ў тысячу такіх торб, як у пябо, не змесціцца. А ну скажы, у якіх краях я не быў? І не скажаш. Ты і не ведаеш такіх краёў, а я быў. Так трэба жыць: ідзі, ідзі — і ўсё тут.

І стары цыган, здзвечны валацуга, доўга расказваў Алёшу розныя гісторыі і казаў памятаць аб тым, што век свой трэба жыць вольнаю птушкаю.

Пасля Макар змоўк і, схаваўшы ў кажух люльку, захінуў на грудзях чакмень*. Пачаў ісці дождж, вецер стаў мацнейшы, мора шумела глуха і злосна. Адзін за адным да патухлага вогнішча падыходзілі коні, нерухома спыналіся, абгуталі іх песным колам.

—Гоп, гоп, э гой, — крыкнуў ім ласкава Макар і пляскаў далонню тыю свайго каханага чорнага каня і сказаў Алёшу:

— Спаць пара! — пасля захінуўся з галавою ў чакмень, пацягнуўся на зямлі і заціх.

З КНІГІ І. ГРУЗДЗЕВА «ЖЫЦЦЕ І ПРЫГОДЫ МАКСІМА ГОРКАГА».

*) Чакмень (татарскае слова) — чэрк мужчынская вопратка падобная на бо

Вайна ў Еўропе, Афрыцы і Азіі

(ДЗЁННІК ВАЕННЫХ ДЗЁЯННЯЎ).

На англа-германскім фронце за мінулыя два дні найбольшую актыўнасць праяўляла авіяцыя. Германскія самалёты апераравалі галоўным чынам на моры. У зводцы германскага камандвання паведамляецца аб патапленні некалькіх англійскіх гандлёвых суднаў. Германская авіяцыя падвергла таксама бамбардыроўцы партовыя збудаванні і ваенныя прадпрыемствы ў Паўднёвай і Паўднёва-Усходняй Англіі. Раніцой 14 чэрвеня, перадае агенцтва Рэйтэр, злучэнне англійскіх бамбардыроўшчыкаў і знішчальнікаў падвергла бамбардыроўцы аэрадромы ў Сент-Омеры. Апрача таго, англійскія знішчальнікі падвергалі кулямётнаму абстрэлу аэрадром паблізу Шэрбурга і германскае патрульнае судна ў Ла-Маншы.

У ноч на 15 чэрвеня англійскія бамбардыроўшчыкі атакавалі прамысловыя аб'екты ў раёне Кельна. Англійскія ваенныя караблі працаўжаюць аперацыі па праследаванню германскіх грузавых суднаў, якія павінны былі служыць базамі снабжэння для караблёў «Бісмарк» і «Прынц Еўгеній». За час аперацыі было патоплена 6 германскіх грузавых суднаў і адзін узброены траулер.

Днём 15 чэрвеня англійскія бамбардыроўшчыкі ўзнавілі свае аперацыі супроць германскіх суднаў ля ўзбярэжжа Галандыі і Францыі, а таксама ў германскіх тэрытарыяльных водах.

У ноч на 16 чэрвеня буйныя злучэнні англійскіх бамбардыроўшчыкаў зрабілі налёт на Рур, Кельн і Ганновер. Іншыя англійскія самалёты атакавалі доки ў Дзюнкерку. Англійскія знішчальнікі зрабілі налёты на французскія аэрадромы.

Ваенныя дзеянні ў басейне **Міжземнага мора** за апошнія дні значна актывізіраваліся. Германа-італьянская авіяцыя пакіроўвае свой асноўны ўдар супроць апорных баз і злучэнняў ваенна-марскога флота англічан у Міжземным моры. Ва Ўсходняй частцы Міжземнага мора, адзначаецца ў зводцы германскага камандвання, германскія бамбардыроўшчыкі патапілі адзін англійскі лёгкі крэйсер. Германская авіяцыя, гаворыцца далей у зводцы, зрабіла налёт на востраў Кіпр, падвергнуўшы бамбардыроўцы аэрадромы. На захад ад Гібралтара, перадае Германскае інфармацыйнае бюро, германскія бамбардыроўшчыкі атакавалі англійскі караван судоў. 15 чэрвеня, паведамляе агенцтва Гавас-ОФІ, зноў быў зроблен налёт на Гібралтар. Англійскія самалёты бамбардзіравалі востраў Радос. Англійскія падводныя лодкі, аперуючыя ў Міжземным моры, патапілі і пашкодзілі, па даных агенцтва Рэйтэр, 10 італьянскіх параходаў.

У Паўночнай Афрыцы найбольш жорсткія бані адбываюцца ў сектары Солума, дзе, згодна зводцы германскага камандвання, буйныя сілы англічан прадпрынялі атаку, але былі адбіты германа-італьянскімі часцямі. У сучасны момант баі ў гэтым раёне працаўжаюцца. На фронце ля Тобрука адзначаюцца дзеянні артылерыі і разведвальных атрадаў. Германскія і італьянскія бамбардыроўшчыкі, паведамляецца ў зводцы германскага камандвання, бамбардыравалі партовыя збудаванні і ўмацаванні Тобрука. Італьянскія самалёты, гаворыцца ў італьянскай зводцы, бамбардыравалі Мерса-Матрух. У камунікеі англійскага камандвання ўказваецца, што англійская авіяцыя зрабіла налёт на Бенгазі. У рэзультаце бамбардыроўкі ў парту ўзніклі пажары. Англійскія самалёты атакавалі таксама аэрадромы ў Мартубе і Эль-Газале, а марская авіяцыя падвергла бамбардыроўцы Трыполі.

Ва Усходняй Афрыцы, у Абісініі, адзначаецца ў італьянскай зводцы, становішча без змен. Згодна камунікеі англійскага камандвання, англічане працаўжаюць аперацыі па акружэнню Джымы.

Ваенныя дзеянні ў Сірыі, перадае іерусалімскі карэспандэнт агенцтва Рэйтэр, адбываюцца на шырокім фронце ад Сайды да Дамаска. Найбольш жорсткія баі разгарнуліся на ўзбярэжжы Лівана, у раёне горада Сайды. 15 чэрвеня англійскія войскі занялі Сайду. Па паведамленню карэспандэнта агенцтва Асошыэйтэд Прэс, французскія войскі, адступіўшы з Сайды, займаюць новыя пазіцыі ў раёне ракі Нахр-Од-Дамур. Як перадае карэспандэнт агенцтва Асошыэйтэд Прэс з Вішы, англійскія войскі прасоўваюцца да Бейрута. У сучасны момант яны знаходзяцца ў 12 мілях ад Бейрута.

15 чэрвеня, гаворыцца ў паведамленні агенцтва Гавас-ОФІ, англійскія бронетанкавыя часці прадпрынялі атаку ў сектары Кісве (у раёне Дамаска). Контратака французскіх часцей прымусіла англічан адступіць. Французскія разведвацельныя атрады праяўлялі вялікую актыўнасць у тылу англічан ля Кісве і ў раёне Мерджайуна. Іерусалімскі карэспандэнт агенцтва Рэйтэр паведамляе, што на ўсход ад Кісве разгортваецца флангавае наступленне ў раёне Бурака, адкуль часці англічан прасоўваюцца ў паўднёва-ўсходнім напрамку. Гэта наступленне дало магчымасць прарваць другую лінію абароны арміі ў Сірыі. Англійскія часці і войскі дэ Голя, згодна паведамленню лонданскага карэспандэнта газеты «Нью-Йорк геральд трыбюн», вялуць наступленне таксама ўверх па даліне ракі Нахр-эль-Касімія, імкнучыся раз'яднаць французскія сілы, якія знаходзяцца ў раёне Бейрута і Дамаска.

У Паўночнай Сірыі англійскія войскі, наступаючыя з Ірака ўздоўж сірыйска-турэцкай граніцы, па паведамленню каірскага карэспандэнта газеты «Дэйлі экспрэс», знаходзяцца паблізу Рас-эль-Айна (на турэцкай граніцы). Адна калона англійскіх войск, працаўжае карэспандэнт, наступае праз пустыню, праходзячы 80 кілометраў у дзень.

Ва Ўсходняй Сірыі, гаворыцца ў камунікеі французскага камандвання, прыбыўшыя з Ірака англійскія бронетанкавыя часці, якія ўвайшлі ў сутыкненне з французскімі войскамі ў Абу Кемале, занялі перадавы пост.

16 чэрвеня (ТАСС).

Выпускнікі Вілейскай школы ФЗА будаўнікоў № 19, якія ад'ежджаюць на сталую работу ў г. Тула (справа налева) **В. Сенько, А. Ваўтроша, Н. Гіль, А. Юшкевіч** і іншыя. Злева — дырэктар школы **А. П. Крукаў.**

Профсаюзна-комсамольскі крос

15 чэрвеня — першы дзень масавага профсаюзна-комсамольскага кроса — у гарадах і сёлах нашай краіны сотні тысяч юнакоў і дзяўчат спаборнічалі ў бегу па перасечанай мясцовасці.

Па спартыўным стадыёне Чырвонай Арміі ў Маскве адбыўся ўрачысты мітынг, прысвечаны адкрыццю кроса. Ад імені ЦК і МК ВЛКСМ удзельнікаў спаборніцтва вітаў сакратар МК ВЛКСМ тав. Пегаў.

— Мэта праводзімых у нашай краіне кросаў, — сказаў ён, — далучыць слаі моладзі да сістэматычных заняткаў фізічнай культурай, рыхтаваць з іх настойлае папаўненне Чырвонай Арміі.

Фізкультурнікаў вітала таксама сакратар ВЦСПС тав. Нікалаева.

— Профсаюзна-комсамольскі крос, — падкрэсліла яна, — будзе аглядам рэзультатаў штодзённай работы спартыўных таварыстваў... Беспрарыўным патокам фінішыравалі на стадыёне Чырвонай Арміі фізкультурнікі маскоўскіх фабрык, заводаў, школ, устаноў, вузаў. Уперадзе многіх груп беглі вядомыя майстры спорта, якія падрыхтавалі да кроса пачынаючых і малавопытных фізкультурнікаў.

Да трох гадзін дня ў бегу па розныя дыстанцыі ўжо прыйшлі ўдзел 12 тысяч чалавек. Тысячы чалавек удзельнічалі ў кросе па іншых базах сталіцы. Дажджлівае, ветранае надвор'е перашкадзіла моладзі Ленінграда прыняць шырокі ўдзел у спаборніцтвах. Але ўсё-ж, па папярэдніх даных, у Ленінградзе і ў Ленінградскай вобласці 15 чэрвеня на старт кроса выйшла каля 45 тысяч чалавек.

У Беларусі першы дзень профсаюзна-комсамольскага кроса ператварыўся ў вялікае фізкультурнае свята моладзі. На старт выйшла каля 100 тысяч спартсменаў. Большасць з іх здала нормы па бегу на значок ГПА. У Кіеве ў кросе ўдзельнічала 11.000 юнакоў і дзяўчат. 80 процантаў з іх выканалі нормы. Добрую вытрымку, выпослівасць паказалі вучні спецшкол, рамесленых вучылішч.

(ТАСС).

ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

„Няма ўвязкі з рэнтгенаўскім кабінетам"

Пад такім загалоўкам у газеце «Зара» ад 18 мая была змешчана заметка, у якой аўтар указваў, што пры адборы школьнікаў у дзіцячыя лагеры і санаторыі дрэнна абслугоўваў дзяцей рэнтгенаўскі кабінет.

Брэсцкі гарадскі аддзел аховы здароўя паведаміў рэдакцыі, што факты, змешчаныя ў заметцы пацвердзіліся. Былі выпадкі, калі дзеці сапраўды падоўгу чакалі чаргі на прыём у рэнтгенаўскі кабінет і ўхадзілі ні з чым. Зараз гэта пытанне ўрэгулівавана. Дзяцей прымаюць у рэнтгенаўскі кабінет без чаргі.

РАСХОДЫ АЎСТРАЛІІ НА ВАЙНУ

ЛОНДАН, 16 чэрвеня (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, аўстралійскі міністр фінансаў Фаддэн заявіў, што да канца чэрвеня расходы Аўстраліі па вайну перавысяць 20 мільёнаў аўстралійскіх фунтаў стэрлінгаў у месяц. У далейшым ваенныя асігнаванні павінны быць павялічаны яшчэ больш. Адзначыўшы неадвальняючае паступленне збераж энняў ад насельніцтва, Фаддэн указаў, што калі добраахвотныя збераж энні не дадуць дастатковых рэзультатаў, то адзіным выхадам для ўрада будзе прымяненне ў той або іншай форме прымусу.

НАВУЧАЛЬНЫ ГОД ЗАКОНЧАН

У гэты сонечны чэрвенькі дзень асабліва па-святочнаму выглядала дзетвара. З раніцы яна запоўніла вуліцы горада. З чырвонымі сцягамі, лозунгамі выйшлі піонеры і школьнікі па дэманстрацыю, прысвечаную заканчэнню навучальнага года. На іх усхваляваных тварах — радасць сённяшняга дня. Закончыўся навучальны год. Наперадзе — лета, адпачынак, многа цікавага, займальнага. Спорт, праца, цікавыя гульні, экскурсіі, рыбалоўства — запоўняць іх канікулы. Многія рэбяты паедуць у лагеры, многія будуць адпачываць на дзіцячых пляцоўках...

Свята пачалося парадам піонераў, прысвечаным агляду піонерскіх атрадаў. Барабаншчыкі старанна выбіваюць дроб. Стройным крокам, святочна апранутыя, загарэлыя праходзяць піонеры. Лёгкі ветрык развявае на іх грудзях чырвоныя гальштукі. Вось ідуць лепшыя атрады горада і Брэсцкага раёна — піонератрады школ 2, 10, 12, Рэчыцкай няпоўнай сярэдняй школы і другія. Не мець піводнай дрэннай адзнакі ў атрадзе, узорна паставіць ваенна - фізкультурную работу, каб кожны піонер здаў нормы па значкі БГПА, ГПА, ЮВС, ГСА, і патрэніраваць сябе ў далёкіх пераходах; мець элементарныя працоўныя навыкі: умець шыць, штопаць, убіраць за сабой — такія былі асноўныя ўмовы агляду. Аб выкананні гэтых умоў з гордасцю рапартавалі лепшыя піонерскія атрады.

У кожнага з піонераў на грудзях па некалькі абаронных значкоў. Піонеры ўмеюць арыентавацца па компасу, ведаюць азбуку Морзе, знаёмы з цяжкасцямі пераходаў. Піонерскі атрад Рэчыцкай НСШ, Брэсцкага раёна, зрабіў 60 кілометровы турысцкі паход на ваколіцах сваёй мясцовасці. Многа цікавых падарожжаў арганізуюць рэбяты гэтага атрада ў летнія канікулы...

Пасля дэманстрацыі ўсе школьнікі арганізавана прышлі ў парк імені 1-е Мая. Тут адбыўся мітынг. З паспяховым заканчэннем навучальнага года вітае школьнікаў загадчык аблапа тав. Коршук. Ён жадае дзецям добрага, радаснага адпачынку: загарэць, паправіцца, набрацца сіл, каб прыйсці ў новы навучальны год яшчэ больш бадзёрымі, моцнымі і вучыцца толькі на выдатна і добра. Цёплае віншуе рэбят з заканчэннем вучобы прадстаўнік ЦК ЛКСМБ тав. Расіпская.

...Жывой і разнастайнай была праграма дзіцячай самадзейнасці. Яе адкрыў аркестр народных інструментаў Дома піонераў. Ён майстэрскі выканаў некалькі складаных музыкальных твораў. Асаблівай арыгінальнасцю вызначаецца выкананне твора «Утро» кампазітара Грыга. Прыемна песціць слух імітацыя салаўіных трэляў і стройныя акорды юных музыкантаў.

Іх змяняюць харавыя ансамблі, танцавальныя гурткі школ і Дома піонераў. Найбольшай папулярнасцю ў рэбят у гэты дзень карысталіся выкапаўны Дома піонераў. Яны паказалі сябе даравітымі зацейнікамі. І музыканты, і танцоры, і спевакі захапілі ўсіх сваім майстэрствам. Вучні першай польскай школы добра выканалі нацыянальны польскі танец «Кракавяк». Іх заслужана праважалі рэбяты адабраючымі апладысментамі...

Канцэрт мастацкай самадзейнасці закончан. І тут хочацца некалькі слоў сказаць аб арганізатарах свята. Яны былі тут нейкімі невідзімкамі, ва ўсякім выпадку сярод дзяцей не зідаць было іх. Мала сабраць дзетвару ў парк, яна і сама з вялікай ахвотай прышла. Галоўнае — дапамагчы ёй весела, культурна правесці сваё свята, арганізаваць масавыя гульні, танцы, каб дзеці маглі сапраўды павесяліцца. І ў гэтым ім ніхто не дапамог. А дзе, пытаемся, настаўнікі раўнікі комсамольскіх і піонерскіх пізацый? Лягчай за ўсё было пасадзіць духавы аркестр па танцавальнай пляцоўцы і іграць дзецям... факстроты. Яны іх вельмі захапілі, і гэта маглі бачыць самі арганізатары, каб яны былі там. Пасля выступлення ўдзельнікаў самадзейнасці, большасць дзяцей пайшла брадзіць па парку і толькі невялікая частка засталася штурмаваць танцавальную пляцоўку, адкуль, да рэчы, дзетвару хутка выціснулі дарослыя.

Г. Будай.

У ГОРВЫКАНКОМЕ

АБ ДЫСЛАКАЦЫІ СУДЗЕБНЫХ УЧАСТКАЎ ГОР. БРЭСТА

Выканком гарадскога Совета дэпутатаў працоўных на сваім пасяджэнні ад 10 чэрвеня 1941 года запвердзіў тры судзебных участкі гор. Брэста з указаннем іх межаў.

Першы ўчастак у межах: з поўначы — палатно чыгункі, з усходу — палатно чыгункі, з поўдня — вул. Розы Люксембург, частка вуліцы імені 17 верасня (паміж вуліцамі Гогаля і Будзённага), і вул. Будзённага, з захаду — крапасць з уваходам вуліц: Орджанікідзе, 9-га студзеня, Міцкевіча, Школьны пер., Мясны перавулак, Пушкінская, Маякоўскага, Гогаля і Будзённага (паўночная старана — чотныя нумары), Каштанавая, Леваневскага, Чкалава, Энгельса, Стаханава, Урыцкага, Розы Люксембург (паўночная старана), Чапаева, Кааператыўная, Крупскай, Комуністычная (да вул. Розы Люксембург), Праспект 17 верасня (да Будзённага на чотнай старане і да Розы Люксембург па нячотнай старане), Карла Маркса (да Будзённага), Комсамольская, Пляц Волі, Совецкая (да Будзённага), Куйбышэва (да Будзённага), 1-га мая (да Будзённага), Леніна (да Будзённага), Кірава (да Будзённага), Халтурына (да Будзённага), Горкага, Менжынскага, Барыкадная і Папаніна.

Другі ўчастак у межах: з поўначы — вул. Будзённага, з усходу — палатно чыгункі, з захаду крапасць з уваходам вуліц: Розы Люксембург (чотная старана), Тэатральная, Серова, Вяроўскага, Прамысловая, Будзённага (чотная старана), Дзержынскага, Свярдлова, Остроўскага, Маскоўская, Базарная, Інтэрнацыянальная, Чырвонафлоцкая, Набярэжная, Шаўчэнкі да палатна чыгункі, Комуністычная (ад Розы Люксембург), Праспект 17 верасня (чотныя нумары ад Будзённага, нячотныя пачатак ад Розы Люксембург да ракі), Карла Маркса ад Будзённага, Беластоцкая, Перэца, Совецкая ад Будзённага да ракі, Куйбышэва ад Будзённага да ракі, 1-га Мая ад Будзённага да ракі, Леніна ад Будзённага да ракі, Кірава ад Будзённага да ракі, Халтурына ад Будзённага да Маскоўскай, Нафтавая, Мопра, Рабочая, Халодная, Паўднёвая, Бронзавая, Хмельная, Малая, Тэльмана, Чырвонасцяжная, праляесце Вальпка, урочышча Соя, Паўднёвы гарадок.

Трэці ўчастак у межах: усё Граёўскае прадмесце, Паўночны гарадок, Брэст I, II, III, усё Кіеўскае прадмесце, вул. Шаўчэнкі ад №№ 77 да 86 да канца.

Нам. адказнага рэдактара С. Т. МАРЧЭНКА

НКЗ СССР

Антопальская школа сярэдняй сельскагаспадарчай асветы Брэсцкай вобласці

АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ НА 1941-42 ВУЧЭБНЫ ГОД.

Асобы, скончыўшыя Антопальскую сельскагаспадарчую школу, атрымоўваюць кваліфікацыю тэхнікаў сельскай гаспадаркі.

Тэрмін навучання 2 годы.

У школу прымаюцца асобы ва ўзросце ад 15 да 35 год, маючыя падрыхтоўку ў аб'ёме няпоўнай сярэдняй школы. Паступаючыя ў школу падвяргаюцца прыёмным іспытам па матэматыцы, рускай мове, фізіцы і Канстытуцыі Саюза ССР.

Асобы, закончыўшыя ў 1941 годзе няпоўную сярэднюю школу з адзнакамі „выдатна", прымаюцца ў школу без іспытаў.

Прыём заяў вытвараецца з 1-га чэрвеня па 18 жніўня. Заявы падаюцца на імя дырэктара школы.

Да заявы павінны быць прыкладзены:

пасведчанне аб адукацыі, даведка аб стане здароўя, даведка аб годзе нараджэння, дзве фотакартачкі (і паштовых марак на 60 кап.), поўная аўтабіяграфія, даведка аб адносінах да ваеннай павіннасці (для ваеннаабавязаных).

Прыёмныя іспыты вытвараюцца ў перыяд з 18 па 28 жніўня. Яўка на іспыты толькі па выкліку дырэкцыі школы. Стыпендыя ў сельскагаспадарчай школе на агульных падставах.

Заявы аб прыёме накіроўваць па адрасу:

БССР, Брэсцкая вобласць, Антопальская сельскагаспадарчая школа Таракань.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Да ведама агароднікаў

Магазін лесакамбіната „ЧЫРВОНАЯ ЗАРА"

прадае тычкі для памідораў і бабовых

Пункт продажу:

Магазін № 11, вугал Маскоўскай і Совецкай

БРЭСЦКАМУ ЛЕСАЗАВОДУ № 1

патрабуюцца

шофер, трактарысты і рабочыя.

Звяртацца па адрасу:

Вялікая Сож, Лесазавод № 1.

Дырэкцыя

Да ведама рэдактараў насценных газет прадпрыемстваў, устаноў і арцеляў гор. Брэста.

Пры рэдакцыі газеты „Зара" (Совецкая 25, другі паверх)

ПАЧЫНАЕ РАБОТАЦЬ

Пастаянны семінар рэдактараў насценных газет

Першыя заняткі адбудуцца 20 чэрвеня ў памяшканні рэдакцыі.

Пачатак семінара ў 7 гадзін вечара.

Просьба да ўсіх рэдактараў своечасова з'явіцца на заняткі.

Рэдакцыя газеты „ЗАРА"

Брэсцкая абласная школа глуханямых дзяцей у БЕЛАВЕЖЫ

Аб'яўляе набор дзяцей у школу

У школу прымаюцца дзеці ад 7 да 14 год. Заяву аб прыёме, даведку аб соцстановішчы бацькоў, метрыку і даведку аб стане здароўя накіроўваць па адрасу: **Белавежа, Піонерская вул. № 23.**

Дакументы прымаюцца да 10-га жніўня. Прыём з 20-га жніўня па 25-га. Залічаныя ў школу дзеці забяспечваюцца інтэрнатам, харчаваннем і вопраткай.

Дырэкцыя школы.

СЁННЯ Ў КІНОТЭАТРАХ

Кінатэатр 1 МАЯ
ПАРЭНЬ З ТАЙГІ
Пачатак сеансаў 5, 7, 9, 11.

Кінатэатр „КІМ"
ПЕСНЯ АБ ЛЮБВІ
Пачатак сеансаў 5, 6.30, 8, 9.30, 11.

РАСПАРАДЖЭННЕ № 7

Выканаўчага камітэта Брэсцкага горсовета дэпутатаў працоўных ад 10 чэрвеня 1941 года

АБ РЭГІСТРАЦЫІ ТРАНСПАРТНЫХ СРОДКАЎ

У мэтах правядзення рэгістрацыі транспартных сродкаў выканком Брэсцкага горсовета РАШЫЎ:

1. Абавязаць усіх грамадзян горада, а таксама ўсе ўстановы і прадпрыемствы, знаходзячыяся на тэрыторыі г. Брэста, зарэгістраваць у комунальным аддзеле выканкома Брэсцкага горсовета маючыяся ў іх транспартныя сродкі (легкавыя і ламавыя ізвозы і веласіпеды).

2. Рэгістрацыю вытвараць адначасова з уплатай падатка за транспартныя сродкі (узымаемага на падставе пастановы выканкома гор. Брэста ад 26 XI 1940 г.).

3. За кожны выданы рэгістрацыйны знак узымаць аплату ў памеры 3 руб. 65 кап.

4. Тэрмін рэгістрацыі ўстанавіць да 30 чэрвеня г. г.

5. Віноўных у нарушэнні гэтага распараджэння прыцягваць да адміністрацыйнай адказнасці — штрафу да 100 руб. або папраўча - працоўных работ да 14 дзён.

6. Нагляд за выкананнем гэтай пастановы ўскласці на органы РК Міліцыі гор. Брэста.

7. Гэта распараджэнне ўваходзіць у сілу праз пяць дзён з дня яго апублікавання і спраўдна на працягу аднаго года.

Выканком горсов

Тыраж 15000. Адказны рэдактар Брэст, вуліца Совецкая 25 (другі паверх). Тэлефоны: адказнага рэдактара — 1-17, нам. адказнага рэдактара — 7-89, адказнага сакратара — 7-16, аддзелаў: земляробчага, прамысловага і культасветы — 1-23 і нічныя рэдакцыя — 7-11. Друкарня Ін. Дзержынскага. УД—1-92